КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 31 (207) ◂ 3 верасня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**СЯРГЕЙ МАЦКЕВІЧ**

Стар. 6

**КОЛЬКІ КАШТУЕ ПЕНСІЯ**

Напярэдадні выбараў улады абыходзяць маўчаннем тэму падвышэння пенсійнага ўзросту

Стар. 5

**НАС ПАДТРЫМАЛІ ТОЛЬКІ ГАРЫ ПОТЭР І БРЫДЖЫТ ДЖОНС**

Пра брытанскую палітыку журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе са Стывенам Гаўжам, адным з кіраўнікоў Ліберальна-дэмакратычнай партыі

Стар. 13

**СОНЦА ЎДАРЫЦЬ ПА РЭЖЫМУ**

Стар. 15

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ІНТЭРНЭТ БЕЛАРУСЬ У ЧАКАННІ МІЛЬЯРДАЎ**

Артыкул Вольгі Хвоін

ПАЛІТЭКАНОМІКА

# ПІЯР ПАДЧАС НАРАДЫ

Вольга ХВОІН

**Аляксандр Лукашэнка ўшчэнт раскрытыкаваў урад прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага. Палітычныя аглядальнікі прадракаюць прэм'еру адстаўку. Але чарговае «ператрахванне» — ці не традыцыйны метад уплыву на свядомасць электарату. Каб кожны ведаў, хто ў Беларусі сапраўдны гаспадарнік.**

Аляксандр Рыгоравіч у запале нават крыху заблытаўся ў сваіх ацэнках эканамічнай сітуацыі ў Беларусі. Спачатку падчас працоўнай паездкі па Гомельскай вобласці заявіў, што «мы выкараскаліся з той сітуацыі, у якую нас паставіла Расія ў пачатку гэтага года». Падчас нарады па пытаннях працы нафтаперапрацоўчай галіны, што адбылася на Мазырскім НПЗ, кіраўнік Беларусі задаволена канстатаваў: «Перапрацоўка, пастаўка для ўнутраных патрэбаў і на экспарт вуглевадароднай сыравіны, забеспячэнне вуглевадароднай сыравінай нашай дзяржавы — падобна пытанню быць або не быць Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржаве. Таму гэта важны кірунак нашай дзейнасці, і мы з гонарам і годнасцю павінны з наяўнай сітуацыі знайсці выхад. Дакладней — знайшлі». Нафтаперапрацоўка ў нас — валютны здабытчык. То бок усё наладзілася, і крэдыты прасіць больш не будзем. Ці ўсё ж папросім? Інакш чаму ўрад краіны ўжо прапануе кіраўніку дзяржавы павялічыць дэфіцыт бюджэту сёлета амаль удвая — на 2,5 трыльёна рублёў і давесці яго да 5,2 трыльёна рублёў?




Разам з тым (што нелагічна, на погляд эканаміста) кіраўніцтва краіны абяцае да канца года падняць узровень сярэдняй заработнай платы па краіне да пяцісот долараў, то бок плануецца падзагрузіць працай друкароў манетнага двара. Бо грошай аб'ектыўна ў бюджэце няма. Але калі дзень выбараў усё бліжэй і бліжэй, то не час думаць пра наступствы. Галоўнае — эмоцыі, пазітыўныя, натуральна ж.

Вось з 1 верасня ўжо падвысілі заробак асобным катэгорыям бюджэтнікаў. Пастановай Савета міністраў вызначаныя карэктуючыя каэфіцыенты да тарыфных ставак 1–27 разраду, што разлічваюцца па Адзінай тарыфнай сетцы. У адпаведнасці з пастановай, на 10% падвышаныя тарыфныя аклады маладым спецыялістам, якія накіраваны на працу па размеркаванні ў бюджэтныя арганізацыі. На 25% падвышаныя тарыфныя аклады педагогам бюджэтных арганізацый, за выключэннем прафесарска-выкладчыцкага складу вышэйшых навучальных устаноў і ўстаноў адукацыі, якія забяспечваюць падвышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў. Таксама на 25% падвышаныя тарыфныя аклады лекарам, уключна з кіраўнікамі, што працуюць у бюджэтных арганізацыях. Тарыфныя аклады работнікам устаноў сацыяльнага абслугоўвання і культурна-асветніцкіх устаноў падвысілі на 15%.

Такім чынам, карэкціроўка заробку «слабых звёнаў» — бюджэтнікаў — мусіць зрабіць рэчаіснасцю планы кіраўніцтва Беларусі аб сярэднім заробку па краіне ў 500 долараў. З 1 лістапада чакаецца падвышэнне заробку ўсіх бюджэтнікаў. Тарыфную стаўку павялічаць удвая — да 180 тысяч рублёў. Плануецца, што пасля падвышэння заробкі ў бюджэтнай сферы складуць прыкладна 405–410 долараў у эквіваленце. Амбіцыі беларускага кіраўніцтва сягаюць яшчэ вышэй: да канца 2015 года зрабіць сярэдні заробак у тысячу долараў.

Дык вось з такімі аптымістычнымі прагнозамі і ацэнкамі Аляксандр Лукашэнка знайшоў крайняга ў невыкананні прагнозных паказчыкаў. Прэм'ер-міністр, як ацаніў, кіраўнік Беларусі, лезе наперад бацькі ў пекла, то бок перавышае сваю кампетэнцыю і становіцца палітыкам. «Вы голы эканаміст, а не палітык. Палітык тут я», — паставіў на месца кіраўніка ўрада Лукашэнка пасля таго, як той прапанаваў падоўжыць крэдыты шэрагу прадпрыемстваў аўтамабільнай галіны — МАЗу, БЕЛАЗу, Белкарду, БАТЭ, МТЗ і заводу аўтагідраўзмацняльнікаў. Летась гэтыя прадпрыемствы атрымалі палёгкавыя крэдыты пад 3% гадавых з пагашэннем у 2011 годзе, з восені надыходзіць час аддаваць пазыкі, але сродкаў прадпрыемствы не маюць.

Раней падобныя паслабленні і саступкі рабіліся многім беларускім прадпрыемствам, і для Лукашэнкі прапанова прэм'ера — не навінка, але цяпер момант, калі перакідваць праблемы эканомікі на іншых асобаў Аляксандру Лукашэнку найбольш выгодна. У кантэксце будучых прэзідэнцкіх выбараў гэта зручны і, трэба сказаць, традыцыйны для Лукашэнкі піяр-ход.

Пасля разгромнай нарады папаўзлі чуткі, што кіраўнік Беларусі хоча зняць прэм'ера з пасады з-за палітычнай рэўнасці (быццам бы Крэмль можа зрабіць на яго стаўку), але ствараць канфлікты, напружваць адносіны ў сваім акружэнні перад знакавымі падзеямі для Лукашэнкі ўсё ж няслушны крок, і як палітык таленавіты ён гэта разумее. Так што змены ўраду да выбараў наўрад ці можна чакаць.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ. ЗА СВАЕ ПРАВЫ

Брэсцкія грамадскія арганізацыі вырашалі паўплываць на мясцовыя ўлады з мэтай удасканалення заканадаўства, інфраструктуры для развіцця веласіпеднага транспарту ў горадзе. Яны заклікалі тых, хто любіць актыўны адпачынак, чыстае паветра і веласіпеды, прыняць удзел у акцыі «Вела-Берасце», падпісацца пад адпаведным зваротам да мясцовых уладаў, а таксама паўдзельнічаць у веласіпедным прабегу ў падтрымку ініцыятывы. Акцыя адбудзецца 4 верасня.

### СВІСЛАЧ. «НАРОДНЫЯ ДЭПУТАТЫ»

Кандыдаты ў дэпутаты ад дэмакратычных плыняў Гродзеншчыны стварылі аб'яднанне «Народныя дэпутаты», якое ўзначаліў мастаўчанін Дзмітрый Кухлей. Яно паставіла на мэце вырашэнне сацыяльных праблем. У вёсцы Грынкі, якая знаходзіцца ў 10 кіламетрах ад Свіслачы і мае болей за 100 двароў, даўно актуальная праблема вывазу смецця. Раней жыхары вёскі звярталіся ў мясцовы камунгас з просьбай дапамагчы вырашыць праблему. Аднак гэта пытанне было перададзена ў мясцовы сельсавет, які арганізоўваў утылізацыю цвёрдых бытавых адыходаў (ЦБА) раз на месяц, што не адпавядае санітарна-тэхнічным нормам. Сябры аб'яднання «Народныя дэпутаты» Віктар Пяцельчыц і Валянціна Пяцельчыц з вёскі Грынкі Свіслацкага раёна накіравалі ў мясцовыя органы ўлады калектыўны зварот грамадзян за арганізацыю сістэматычнай утылізацыі ЦБА з падворкаў вёскі і просьбай усталяваць адмысловыя кантэйнеры для смецця ды арганізаваць вываз ЦБА не радзей як раз на тыдзень.

### ДЗЯРЖЫНСК. «СТОП 193.1!» НА ГАРУ

Актывісты Асамблеі НДА ўзняліся на самую высокую кропку краіны з расцяжкай кампаніі «Стоп 193.1!» — на гару Святую (афіцыйная назва — гара Дзяржынская). З гэтай сімвалічнай акцыі пачынаецца новы этап змагання за адмену адыёзнага артыкула Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Гара Святая — вышэйшая кропка ў Беларусі, якая знаходзіцца на ўзроўні 345 метраў над узроўнем мора. Менавіта з яе вяршыні і было вырашана звярнуць увагу на праблему абмежавання свабоды асацыяцыяў.

Актывісты Асамблеі НДА запэўнілі, што кампанія «Стоп 193.1!» будзе працягвацца да моманту скасавання ганебнага артыкула.

### ЗЭЛЬВА. АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫЙ

Адроджаны «Анненскі кірмаш» сабраў у Зэльве каля 6 тысяч удзельнікаў і гасцей. Названы ён так у гонар святой Ганны і ў XVIII стагоддзі быў адным з самых вялікіх і знакамітых кірмашоў у Еўропе. У свой час сюды з'язджаліся гандляваць да 5 тысяч купцоў. Кірмаш цягнуўся месяц. Яго ўдзельнікі прывозілі на продаж коней, тытунь, спецыі, адзенне, абутак, мастацкія вырабы і іншыя тавары з розных краін, у тым ліку Грэцыі, Турцыі, Персіі. У часы «Аннескага кірмашу» гаварылі, што зэльвенцы 11 месяцаў сумуюць, а месяц жывуць.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

## АМБАСАДАР ДЗЕЦЯМ

**Генадзь КЕСНЕР**

**31 жніўня новы амбасадар Германіі ў Беларусі доктар Крыстаф Вайль узяў удзел у адкрыцці дзіцячай гульнёвай пляцоўкі ў пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна. Гэта пляцоўка стала падарункам мясцовай школе ад нямецкага пасольства, якое прафінансавала яе ўзвядзенне.**



Фота аўтара

«Першы званок» у Калодзішчах і адкрыццё школьнай пляцоўкі сталі першым публічным мерапрыемствам Крыстафа Вайля ў якасці пасла ў Беларусі. Гэты дабрачынны праект, які дае магчымасць адпачываць і гуляць на свежым паветры 750 мясцовым школьнікам, быў рэалізаваны ў межах праграмы Тэхнічнага супрацоўніцтва з дапамогай Мясцовага фонду ўстойлівага развіцця «Інавацыі для рэгіёнаў» у Калодзішчах.

Нямецкага амбасадара суправаджалі супрацоўнікі пасольства, старшыня Праўлення Нямецкага эканамічнага клуба ў Беларусі Клаус Байер. З беларускага боку прысутнічалі старшыня Мінскага райвыканкаму Пётр Яраш, супрацоўнікі мясцовага аддзелу адукацыі.

Звяртаючыся да прысутных настаўнікаў, вучняў каладзішчанскай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы і іх бацькоў, Крыстаф Вайль падзякаваў за запрашэнне прыняць удзел у святе «першага званка» і за магчымасць урачыста адкрыць дзіцячую гульнёвую пляцоўку.

«Кажуць, што немцы заўсёды шмат гавораць. Але сёння буду выключэннем, бо мне сорамна перад вамі рабіць моўныя памылкі, — пажартаваў дыпламат. — Некаторыя палітычныя назіральнікі маглі б адзначыць, што наша сённяшняе мерапрыемства — адкрыццё гульнёвай пляцоўкі — не з'яўляецца сур'ёзнай справай у дачыненнях паміж народамі, але я з гэтым не згодны. Падмурак сяброўскіх адносінаў паміж дзяржавамі заўжды будуецца на чалавечых стасунках, арыентаваных на будучыню. А што можа быць лепшае ў будучыні, як не радасць дзяцей?»

Двое старшакласнікаў звярнуліся да нямецкіх гасцей на іх роднай мове і паабяцалі захоўваць і берагчы пляцоўку, каб на ёй маглі гуляць і іншыя пакаленні хлопчыкаў і дзяўчынак. Дырэктар каладзішчанскай школы Валянціна Вялікаселец ад імя настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў падзякавала нямецкую амбасаду за такі цудоўны падарунак.

Крыстаф Вайль паабяцаў, што гэта не апошні дабрачынны праект з удзелам нямецкай амбасады, гуманітарнаму супрацоўніцтву новы кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва ФРГ збіраецца надаваць вялікую ўвагу падчас сваёй місіі ў Беларусі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## СВЯТА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**Аляксей ХАДЫКА**

**31 жніўня ў Вялікім тэатры оперы і балета /ў Мінску амбасада Украіны арганізавала ўрачысты прыём у гонар свята 19-годдзя Незалежнасці краіны, якое было адзначана 24 жніўня.**

Прадстаўнікам акрэдытаваных у Беларусі дыпламатычных місій, беларускіх дзяржаўных, навуковых і культурніцкіх установаў, палітыкам, грамадскім дзеячам і журналістам была прадстаўлена кароткая відэасправаздача з пераломных для ўсяго былога СССР 1990-х гадоў і зварот новага прэзідэнта Украіны. На вялікім экране праплылі жывы ланцуг людзей, якія ў дні абвяшчэння незалежнасці рука ў руку сталі ад Кіева да Львова, жоўта-блакітны сцяг, упершыню ўзняты над Львоўскай ратушай, сцэны падпісання дамовы ў Віскулях у снежні 1991 года. У прамове Віктара Януковіча гучалі важныя словы пра ўмацаванне дэмакратычнай дзяржаўнасці, грамадскай супольнасці і свабоды слова ў краіне, прынцыпы, якія ён лічыць найважнейшымі для развіцця сваёй краіны.

З вітаннямі да прысутных звярнуліся Раман Безсмертны, надзвычайны і паўнамоцны пасол Украіны ў РБ, і ад беларускага боку намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка. Раман Безсмертны, адзначыўшы важнасць падзеі — «заваявання незалежнасці, за якую змагаліся і гінулі пакаленні ўкраінскага народу, і якая нарэшце адбылася», пажадаў далейшага ўмацавання беларуска-ўкраінскага сяброўства. Андрэй Еўдачэнка заўважыў, што Украіна і Беларусь маюць вялізны патэнцыял і ўсе магчымасці для развіцця двухбаковых адносін.

Канцэрт, які завяршыў імпрэзу, паказаў, што і стасункі ў галіне культуры маюць усе магчымасці пашырацца. У выкананні беларускіх артыстаў — лірычнага тэнара Эдуарда Мартынюка, Алы Губы-Пласкіны, Андрэя Валенція, украінскіх — саліста Нацыянальнай оперы Украіны Сурэна Максутава і іншых прагучалі арыі з опер М. Лысенкі «Тарас Бульба» і «Наталка-палтаўка», Дз. Смольскага «Сівая легенда», Дж. Пучыні і Дж. Вердзі.

ІНТЭРНЭТ

## КІТАЙСКІ ДОСВЕД ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Вольга ХВОІН**

**З 1 верасня ў Беларусі ўводзіцца фільтрацыя інтэрнэт-кантэнту. Цяпер правайдэры абавязаныя мець сістэмы абмежавання доступу да некаторых інтэрнэт-рэсурсаў. У няміласць трапілі матэрыялы экстрэмісцкага, парнаграфічнага характару, прапаганда гвалту, звесткі пра незаконны зварот зброі і боепрыпасаў, інфармацыя, якая садзейнічае гандлю людзьмі.**

Спіс табуяваных рэсурсаў складае Дзяржаўная інспекцыя па электрасувязі на падставе рашэнняў кіраўнікоў Камітэта дзяржкантролю, Генеральнай пракуратуры, Аператыўна-аналітычнага цэнтру, рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання.

Цяпер сайты з такім напаўненнем немагчыма будзе прагледзець з кампутара на працоўным месцы ў дзяржустанове, арганізацыі адукацыі і культуры. Фільтры на згаданыя тыпы інфармацыі будуць прымяняцца незалежна ад таго, дзе знаходзіцца сайт і якім відам доступу паслугоўваецца карыстальнік інтэрнэту. Магчымая таксама фільтрацыя інтэрнэт-кантэнту па запыту карыстальніка, напрыклад, калі бацькі хочуць заблакаваць доступ да некаторых рэсурсаў з кампутара свайго дзіцяці. Да слова, выдаткі на фільтрацыю правайдэры плануюць перакласці на карыстальнікаў.

Палажэнне аб парадку абмежавання доступу карыстальнікаў інтэрнэт-паслуг да інфармацыі зацверджана пастановай Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры прэзідэнце і Мінсувязі 29 чэрвеня. Дакумент прыняты ў выкананне прэзідэнцкага ўказу № 60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт».



Калі гаворка вядзецца пра рэгуляванне інтэрнэту, то звычайна ўзгадваецца Кітай, дзе сеціва, сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку і электронныя, знаходзяцца пад кантролем уладаў. Грамадскасць нашай краіны ўжо шматкроць выказвала занепакоенасць наконт магчымага ўвядзення цэнзуры ў сувязі з фільтрацыяй інтэрнэту. Цяпер шэраг незалежных СМІ з-за неспрыяльных умоў працы сышлі ў інтэрнэт. І калі чыноўнікі палічаць іх кантэнт дэструктыўным, то правайдэры будуць абавязаныя заблакаваць доступ да такіх сайтаў.

Гендырэктар УП «Надзейныя праграмы» (tut.by) Юрый Зісер пакуль не драматызуе сітуацыю і звяртае ўвагу на тое, што фільтрацыя першапачаткова мае добрыя намеры. «Указ быў прыняты паўгады таму, але пакуль нікога надта не абмежаваў. Трэба паглядзець, як будзе ўсё на практыцы, але думаю, што ўрэшце гэтыя абмежаванні толькі павялічаць колькасць хатніх падключэнняў да інтэрнэту, бо на працы многія будуць абмежаваныя ў доступе», — робіць выснову ўладальнік буйнейшага інтэрнэт-парталу ў Беларусі.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГАРАЧАЯ ФАЗА ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ВАЙНЫ

Сяргей САЛАЎЁЎ



Photo.ByMedia.Net

**Падаецца, што інфармацыйная вайна Беларусі і Расіі перайшла ў больш гарачую фазу: з віртуальнай інфармацыйнай прасторы ў бок рэальных дзеянняў. На гэтым тыдні невядомыя ледзь не спалілі службовы аўтамабіль расійскага пасольства Беларусі ў Мінску.**

30 жніўня ў 22.20 супрацоўнікі спецыяльнага батальёна міліцыі ўпраўлення дэпартамента аховы МУС Беларусі па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установаў, якія неслі службу па ахове пасольства РФ, выявілі падчас абходу тэрыторыі ўзгаранне службовай аўтамашыны «Мазда–3».

Падчас агляду месца здарэння супрацоўнікамі следча-аператыўнай групы Цэнтральнага РУУС Мінска былі знойдзеныя шкляная бутэлька ёмістасцю 0,33 літра з-пад слабаалкагольнага напою з рэшткамі гаручай сумесі, а таксама аскепкі шкляной бутэлькі з рэшткамі кнота.

Ахвяраў няма, апроч бязвіннай машыны. Зараз міліцыя Беларусі шукае падпальшчыкаў. Але ці знойдзе?

Гэты інцыдэнт падліў алею ў вогнішча расійска-беларускіх, і без гэтага няпростых адносін. Справа ў тым, што бакі — як расійскі, так і беларускі, — не дачакаўшыся вынікаў расследавання, пачалі абвінавачваць адзін у аднаго ў правакацыі, скіраванай на тое, каб сапсаваць і без таго сапсаваныя адносіны паміж краінамі. Беларускі праўладны палітолаг, кіраўнік аналітычнага цэнтра *EcooM* Сяргей Мусіенка, які ў інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс-Захад» выказаў меркаванне, што інцыдэнт можа быць правакацыяй з боку расійскіх спецслужбаў, спланаванай для таго, каб «узарваць» адносіны Беларусі і Расіі.

Рускія не засталіся ў баку, але іх каментары былі ўзроўнем вышэй. У прыватнасці, заяву пра тое, што беларускія ўлады ведалі пра магчымы «тэракт» у дачыненні да расійскага пасольства, але сядзелі склаўшы рукі, зрабіў кіраўнік палітычнага дэпартамента партыі «Адзіная Расія» Аляксей Чадаеў. Больш радыкальна выказаўся лідэр Ліберальна-дэмакратычнай партыі Расіі Уладзімір Жырыноўскі. «Гэта пачатак перадвыбарчай барацьбы прэзідэнта Лукашэнкі. Можа, не ён сам гэта запланаваў. Але з ягонага штаба вырашылі абвастрыць адносіны з Расіяй», — заявіў Жырыноўскі.

Як вядома, Жырыноўскі з'яўляецца «неафіцыйным рупарам» меркаванняў кіраўніцтва Расіі.

Беларусь можа нівеляваць увесь гэты «распал варожасці» вельмі проста: знайсці і паказаць тых падпальшчыкаў, якія шпуляюць «кактэйлі Молатава» на тэрыторыю пасольства сяброўскай нам дзяржавы. Але, як паказвае гісторыя, наўрад ці іх знойдуць. Хіба што на анархістаў можна ўсё спісаць, бо яны ўзялі на сябе адказнасць за здарэнне.

Гэта ўжо трэці напад на пасольства Расіі ў Мінску. Першы інцыдэнт здарыўся ў ноч на 1 красавіка 1997 года. Тады будынак дыпламатычнага прадстаўніцтва быў абстраляны з аўтамата Калашнікава. Сляды ад куль былі знойдзеныя не толькі на сценах амбасады, але і суседняга жылога дома. Побач з месцам здарэння быў знойдзены кінуты аўтамат і некалькі стрэляных гільзаў. Другая атака адбылася ў ноч на 1 чэрвеня 2001 года. Тады на тэрыторыю пасольства ў сталіцы Беларусі невядомымі была кінутая выбухоўка. Выбухам была пашкоджаная агароджа, ніхто не пацярпеў.

Абодва разы вінаватых не знайшлі. І наўрад ці гэтая тэндэнцыя зменіцца зараз.

А вось скарыстаць гэта «хуліганства» знутры краіны ўлады могуць, і вельмі любяць гэта рабіць. Прыкладам, з-за першага інцыдэнту па следчых органах шмат пабегалі сябры «Маладога фронту», даказваючы, што яны не вярблюды. Варта адзначыць і іншыя выбухі, такія, як выбух на свяце ў Дзень Незалежнасці 2008 года. Першыя, хто быў затрыманы тады, — актывісты патрыятычнай арганізацыі «Белы легіён». Па выбухах на дыскатэках у Віцебску ў 2005 годзе таксама прымаліся найперш за мясцовых апазіцыянераў. А зараз нас чакаюць і прэзідэнцкія выбары, на якіх «прыцісную» апазіцыю сам Бог вызначыў. Чаму б не скарыстацца момантам? Тым не менш, сам Лукашэнка таксама нас парадаваў. Усё жыццё мы ведалі, што ягоны дзень народзінаў — 30 жніўня. Але раптам 1 верасня высветлілася, што біяграфію прэзідэнта «падправілі», і дзень народзінаў перанёсся на 31 жніўня. Гэта выклікала шмат цікавых і вясёлых каментараў.

Як растлумачыла БелаПАН крыніца ў Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы, сутнасць у тым, што маці Аляксандра Лукашэнкі паступіла ў раддом 30 жніўня вечарам, але нарадзіла ў ноч з 30-га на 31-е. «У 50-я гады ў раддамах у сельскай мясцовасці, зразумела, ніхто з секундамерам не стаяў, і дакладны час нараджэння дзіцяці не адзначаўся. І нованароджанага запісалі на 30 жніўня, па даце паступлення парадзіхі ў раддом», — сказаў суразмоўца.

«З-за таго, што прэзідэнт з прахалодай ставіцца да гэтага свята, ён не надаваў яму значэння да моманту нараджэння малодшага сына Мікалая, які з'явіўся на свет 31 жніўня, — адзначыла крыніца. — А пасля нараджэння Мікалая прэзідэнт пачаў цікавіцца ў маці падрабязнасцямі свайго з'яўлення на свет і высветліў, што фактычна адзначаць дзень нараджэння трэба 31 жніўня».

Гэта ж трэба, дажыць да 55 гадоў, і не ведаць, калі ты нарадзіўся! Праўда, крыўдзіцелі Аляксандра Рыгоравіча заўважылі, што змяніць дзень нараджэння Колі Лукашэнкі было б прасцей, усё роўна ніхто дакладна не ведае, адкуль ён узяўся. Але ж яны забыліся на тое, што прэзідэнт, як і салдат, дзіцёнка крыўдзіць не павінен!

Ну і больш кранальная для ўсіх навіна пра тое, што з пачатку восені мы зараз пішам па-новаму «у нескладовае» і некалькі іншых літар. 1 верасня набыў моц новы закон аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, прыняты ў 2008 годзе.

Асноўныя змены зводзяцца да ўдакладнення правілаў пераносу слоў, напісання малой і вялікай літар, да пашырэння напісання «ў», а таксама распаўсюджання прынцыпу «акання» на значную частку запазычаных слоў.

Праект новай рэдакцыі правіл, падрыхтаваны вучонымі і супрацоўнікамі Міндукацыі, выклікаў неадназначную рэакцыю ў грамадстве, доўга ўзгадняўся і набыў моц закону толькі ў 2008 годзе. Як лічыць дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАНБ, доктар філалагічных навук, прафесар Аляксандр Лукашанец, новая рэдакцыя правіл павінна ўмацаваць пазіцыі беларускай мовы і павысіць яе аўтарытэт як строга ўнармаванай пісьмовай мовы з багатым слоўнікавым складам. Акрамя таго, паводле меркавання Лукашанца, новыя правілы дазволяць захаваць традыцыю пераемнасці пісьмовай беларускай мовы і спыніць «арфаграфічны разнабой», які праявіўся ў 1990-я гады і да гэтага часу існуе на старонках беларускамоўных выданняў.

У сваю чаргу, прадстаўнікі РГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» перакананы, што любыя змены правапісу беларускай мовы магчымы толькі пасля вяртання ёй статусу адзінай дзяржаўнай мовы. Яны звяртаюць увагу на тое, што новы закон не прадугледжвае змену незадавальняльнай сітуацыі з выкарыстаннем беларускай мовы ў розных сферах грамадскага жыцця.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ТАЦЦЯНА ДРАЗДОЎСКАЯ



Беларуская яхтсменка Таццяна Драздоўская перамагла па выніках васьмі гонак на чарговым этапе Кубка Еўропы. У гэтым сезоне на рахунку спартсменкі ўжо тры перамогі ў этапах Кубка Еўропы, паведамляе сайт *yachting.by*. Таццяна Драздоўская з'яўляецца лепшай спартсменкай у класе «Лазер-Радыял» у Беларусі. Таццяна — шматразовы чэмпіён нашай краіны, прызёр і пераможца этапаў Кубка свету, удзельніца фіналаў чэмпіянатаў свету і Еўропы. У 1997 годзе прадстаўніца нашай немарской краіны стала чэмпіёнкай свету і заваявала Алімпійскую ліцэнзію, у выніку Таццяна прадстаўляла Беларусь на трох Алімпійскіх гульнях (2000, 2004, 2008). На Алімпійскіх гульнях 2008 года спартсменка заняла 23-е месца, яна з'яўляецца лідэрам нацыянальнай каманды і кандыдатам на ўдзел у Алімпійскіх гульнях 2012 года.

Таццяна Драздоўская пачала займацца ветразевым спортам у 1992 годзе. І праз чатыры гады была залічана ў штатны склад нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь. Цяпер працуе ў Міністэрстве спорту і турызму інструктарам.

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА




Нязменны кіраўнік Беларусі адзначыў 56-ы дзень нараджэння. Ад гэтага года Аляксандр Рыгоравіч на дзень маладзейшы -- у яго афіцыйнай біяграфіі дзень народзінаў цяпер не 30 жніўня, а 31. У гэты ж дзень нарадзіўся малодшы сын Лукашэнкі Мікалай. Прэс-служба прэзідэнта адмаўляе змены ў біяграфіі, але ж масавай амнезіі пакуль у нашых суайчыннікаў не назіралася. Святочны дзень Лукашэнка правёў у рабочай паездцы па Гомельскай вобласці. У Мазырскім раёне абмяркоўвалася харчовая бяспека краіны ды патрэбы павелічэння экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі. Падчас наведвання Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу размовы вяліся вакол тэмы паставак венесуэльскай нафты.

Прэс-служба Адміністрацыі прэзідэнта не распаўсюджвае інфармацыю, як кіраўнік Беларусі адзначае свае дні народзінаў, адзінае, што Павел Лёгкі аднойчы заўважыў, што святкаванні звычайна сціплыя. Падчас аднаго з выступаў Аляксандр Лукашэнка сказаў, што не ўхваляе памкненняў падначаленых дагадзіць яму. «Як толькі ты бачыш, што табе пачынаюць глядзець у рот і спяваць песні хвалебныя — усё, труба. Заўтра рухне краіна… Што, маімі партрэтамі і лозунгамі ўвешаная сталіца, іншыя гарады краіны? Мясніковіч ведае, як у часы ягонага кіраўніцтва прэзідэнцкай адміністрацыяй я адрэагаваў, калі ў калоне дэманстрантаў пранеслі партрэты кіраўніка дзяржавы. Я яго выклікаў і папярэдзіў: яшчэ адзін партрэт, арганізаваны падчас дэманстрацыі, і ты не будзеш кіраўніком адміністрацыі». Аднак, чаго крывіць душой, асоба Лукашэнкі ў свядомасці беларусаў замацаваная як асоба нязменнага прэзідэнта і «добрага цара».

### ГАННА ГОМАНАВА



Ганна Гоманава папулярызуе жывапіс праз аголеную натуру. Каб наблізіць да аўдыторыі ўласныя карціны, мастачка зрабіла пікантную фотасесію напярэдадні адкрыцця другой персанальнай выставы ў Мінску. Экспазіцыя пад назвай «Ваяж» прысвечана падарожжам мастачкі па свеце.

— Тэма аголенасці цэлаў вечная і актуальная. Вядома, калі гэта не выглядае пахабна, — расказала «Салідарнасці» мастачка, а па сумяшчальніцтву прафесійная мадэль Ганна Гоманава. — Фотасесія выкананая прафесійна. Гэта не нейкая спантанная праца — я і мая каманда сур'ёзна рыхтаваліся, імкнуліся стварыць якасны прадукт. Фатаграфіі будуць скарыстаныя для друкаванай прадукцыі — плакатаў, запрашальных, буклетаў, якія рэкламуюць выставу карцін.

У скарбонцы аўтара з дынастыі знакамітай сям'і мастакоў гэта будзе ўжо другая персанальная выстава. Адкрыццё першай адбылося летась у сталічнай галерэі «Ласандр-арт». Тады піяр-кампанія была не менш правакацыйнай. Аголеная мастачка, прыкрываючы інтымныя часткі цела толькі карцінамі, з білбордаў і глянцавых старонак заклікала ацаніць сваю творчасць усіх неабыякавых.

Адкрыццё персанальнай выставы Ганны Гоманавай адбудзецца 4 верасня ў гатэлі Crowne Plaza. Экспазіцыя будзе даступная для прагляду ўсіх жадаючых на працягу двух тыдняў.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# КАСТРЫРАВАНАЯ САЦЫЯЛОГІЯ

Сяргей НІКАЛЮК

**У чым галоўная нацыянальная асаблівасць вымярэння рэйтынгаў палітыкаў у Беларусі? У тым, што значэнні рэйтынгаў палітыкаў не задавальняюць.**



Нядаўна паразмаўляў у «Аднакласніках» са сваім старым універсітэцкім прыяцелем. Калі той даведаўся, што я цікаўлюся сацыялогіяй, быў вельмі здзіўлены: «А няўжо і без сацапытанняў не зразумела, хто ў Беларусі пераможа на выбарах?» Мой прыяцель ужо каля 20 гадоў жыве ў Амерыцы. Узначальвае буйную лабараторыю ў кампаніі «Pfizer» — у той самой, знакамітай сваімі блакітнымі таблеткамі. Яго погляд на сацыялогію як на «навуку», якая займаецца прадказаннямі вынікаў выбараў, зразумелы. Ён спецыяліст у галіне храматаграфіі.

Большасць з апазіцыйных палітыкаў у храматаграфіі, натуральна, не разбіраюцца, што не перашкаджае амаль усім з іх абмяжоўваць сваю цікавасць да сацыялогіі выключна рэйтынгамі. Пры гэтым у аб'ектыўнасць рэйтынгаў яны не вераць і тлумачаць свой недавер «спецыфікай Беларусі». Маўляў, шмат хто баіцца выказваць негатыўную інфармацыю пра Лукашэнку, таму, адпаведна, узровень ягонай ацэнкі ніжэйшы, а ўзровень ацэнкі апазіцыйных палітыкаў — вышэйшы. Такое стаўленне да сацыялогіі сфармавалася яшчэ ў пачатку 90-х. Вады з тых часоў сплыло нямала, але апазіцыйная шарманка іграе ўсё тую ж мелодыю.

## У палку прыхільнікаў зменаў папаўненне

Чаму распаўся Савецкі Саюз? Існуюць дзясяткі навуковых тэорый, якія тлумачаць прычыну «найбуйнейшай геапалітычнай катастрофы XXI стагоддзя». На думку сацыёлага Юрыя Левады, СССР распаўся, таму што ўпёрся ў сваё самае галоўнае абмежаванне — у прыроду «чалавека савецкага». Калі гэта сапраўды так, то шлях Беларусі з савецкага мінулага ў Еўропу немагчымы без змены чалавека.

Здавалася б, пры такой логіцы апазіцыйныя палітыкі павінны стаць галоўнымі заказчыкамі незалежных сацыялагічных даследаванняў. Яны ж, па выразу Жванецкага, «*работают с людЯми*», а сацыялогія — гэта эмпірычная навука, што вывучае сацыяльныя (утвораныя людзьмі) сістэмы ў іх функцыянаванні і развіцці.

Сацыялагічныя апытанні — адна з прыладаў, што дазваляе вывучаць такія сістэмы. Апытанні праводзяць не дзеля рэйтынгаў. Самі па сабе рэйтынгі, як, зрэшты, кожная асобна ўзятая лічба апытання, не азначаюць нічога. Тут будзе дарэчы правесці паралель з рэнтгенаўскім здымкам. Для неспецыяліста ён уяўляе набор чорна-белых плямаў. Іх расшыфроўка магчымая толькі ў рамках вызначаных навуковых тэорый.

У гэтым сэнсе табліцы сацапытанняў адрозніваюцца ад рэнтгенаўскіх здымкаў толькі тым, што складаюцца са слоў і лічбаў. Узятыя паасобку, яны падаюцца на першы погляд зразумелымі, але толькі на першы погляд. Растлумачу на прыкладзе апошняга апытання НІСЭПД. 62% рэспандэнтаў адзначылі ў чэрвені, што Беларусі патрэбныя змены. Напрошваецца варыянт трактоўкі: «Ура! Большасць беларусаў — прыхільнікі зменаў!» На фоне такой сацыялогіі цалкам лагічнай выглядае выснова, што «час Лукашэнкі сышоў».

Аднак прыгледземся да прыхільнікаў зменаў. Палова з іх згодная з тым, што Беларусь развіваецца ў правільным кірунку, 51% давярае Лукашэнку. Прыкладна столькі ж не згодныя з заявамі апазіцыі наконт шматлікіх парушэнняў закона падчас мясцовых выбараў, якія прайшлі ў сакавіку. Пра якія змены тады ідзе размова? Адназначнага адказу на гэта пытанне няма. Калі даражэе цукар і грэчка, беларускі пенсіянеры папаўняюць лагер прыхільнікаў зменаў. Пад зменамі яны разумеюць вяртанне да ранейшых коштаў.

## Прымус да перамогі

У такой выбарчай зацікаўленасці ў выніках сацыялагічных даследаванняў павінна быць прычына. Выкажу сваю версію, абапіраючыся на адну з прапісных ісцін сацыяльнай псіхалогіі, — маецца на ўвазе сацыяльны ціск.

Справа ў тым, што не толькі большасць апазіцыйных палітыкаў, але і большасць незалежных аналітыкаў уяўляюць сабе палітычнай працэс у Беларусі як супрацьстаянне ўлады і апазіцыі. Такое ўяўленне імпартавана да нас з Захаду. Там кожны ахвочы можа назіраць яго няўзброеным вокам.

Аднак для таго, каб апазіцыя магла праціўстаяць уладзе на выбарах, і каб выбары былі выбарамі, а не імітацыйным сурагатам, павінна існаваць, як мінімум, сучаснае грамадства. У адрозненне ад насельніцтва, сучаснае грамадства складаецца з грамадзян — гэта значыць з індывідаў, якія выбудоўваюць свае адносіны з дзяржавай не на падпарадкаванні, а на аснове ўзаемных правоў і абавязкаў.

У савецкі час была папулярная песня пра «*комсомольцев-добровольцев*», якія мусілі «*верить, любить беззаветно*». Для разумення сэнсу «*беззаветности*», я дам слова культуролагу Ігару Якавенку: «Запавет азначае кантракт, які заключаецца бакамі, што дамаўляюцца, і вызначае іх правы і абавязкі. Адпаведна, «*беззаветное служение*» раўназначна служэнню па-за кантрактам і без кантракту, г. зн. служэнню, ніякімі асабістымі інтарэсамі і правамі, якія іх гарантуюць, не апасродкаванаму. Але гэта — мадэль узаемаадносін патрыярхальнага сямейнага самадзержца з дамачадцамі. І адначасова мадэль узаемаадносін войска, але — не кантрактнага, а пабудаванага па прынцыпе абавязковай службы».

Беларусь — краіна хрысціянская, а хрысціянства заснавана на ідэі запавету (кантракту) паміж Богам і чалавекам, таму Біблія і ўключае ў сябе Стары і Новы Запавет. На жаль, у праваслаўі ідэя запавету была адсунутая на другі план. Зразумела, што ў сучасных беларускіх умовах «праваслаўны атэіст» у яе прасоўванні не зацікаўлены.

Адкрыем на прэзідэнцкім сайце афіцыйную біяграфію кіраўніка дзяржавы: «А. Р. Лукашэнка цэніць падтрымку людзей і ганарыцца тым, што ў народзе яго завуць «бацькам» — так заўсёды называлі ў нас людзей аўтарытэтных, якія мужна баранілі інтарэсы сям'і і абшчыны». Параўнаеце дзве цытаты. «Бацька» — гэта сінонім патрыярхальнага сямейнага самадзержца. Грамадства, якое ўспрымае прэзідэнта як «бацьку», а дзяржаву як сям'ю, не можа быць сучасным. Такому грамадству для выказвання сваіх інтарэсаў не патрэбныя партыі, ужо хаця б таму, што ў яго чальцоў няма сваіх персанальных інтарэсаў.

Вось пры такім «аўтарытарным кантэксце» актывістам апазіцыйных партый і даводзіцца займацца палітыкай. Рабіць гэта яны спрабуюць на заходні манер — праз удзел у выбарах, мэтай якіх, натуральна, з'яўляецца перамога. Адмовіцца ад алгарытму дзеянняў, які склаўся, яны не ў стане, таму што знаходзяцца пад магутным сацыяльным прэсам з боку «сваіх» аналітыкаў і «сваіх» патэнцыйных выбарцаў. Як першыя, так і другія чакаюць ад іх толькі перамогі.




## Пра рэйтынгі і крыху пра асабістае

Калі чалавек чагосьці вельмі хоча, то ён з навакольнага свету пачынае вылоўліваць знакі, якія, на яго думку, сігналізуюць пра набліжэнне жаданага. У папулярным у часы маёй маладосці італьянскім фільме «Аперацыя «Святы Януарый» жыхары Неапалю былі захопленыя латарэямі. У любой падзеі яны найперш бачылі зашыфраваныя лічбы, якія трэба было ўпісаць у латарэйныя квіткі.

Тое, як такога кшталту пошук знакаў выглядае ў нашым выпадку, можна праілюстраваць на прыкладзе, запазычаным мной на адным з партыйных сайтаў. «Такім чынам, у найбліжэйшую нядзелю за Мілінкевіча гатовыя прагаласаваць 4% выбарцаў. Няшмат. І не вельмі перспектыўна, асабліва з улікам таго, што пяць гадоў таму ў Аляксандра Уладзіміравіча было за 20%. Гэта значыць, трэнд на скарачэнне электаральных сімпатый відавочны». На падставе прыведзеных дадзеных казаць пра трэнд я б не спяшаўся. 20% — гэта ўзровень падтрымкі ў дзень выбараў ва ўмовах мабілізацыі выбарцаў. Параўноўваць мабілізацыйны рэйтынг з бягучым рэйтынгам некарэктна. Параўнаеце: у Лукашэнкі непасрэдна пасля выбараў у красавіку 2006 года рэйтынг — 60%, а ў чэрвені 2008 года — 40%.

«Пойдзем далей. А як ідуць справы з такім паказчыкам, як адмоўны рэйтынг? 15% апытаных ні пры якіх акалічнасцях не прагаласавалі б за Мілінкевіча. Для параўнання: супраць Някляева катэгарычна настроеныя 6%, а ў дачыненні да Раманчука і таго менш — 3%». У прынцыпе павялічэнне ўзроўню пазнавальнасці падвышае рэйтынг. Вось толькі выснова гэта справядлівая як для пазітыўнага рэйтынгу, так і для негатыўнага. У маёй жонкі негатыўны рэйтынг роўны нулю. За гады нашага з ёй сумеснага жыцця (са жніўня 1999 года) ні адзін з рэспандэнтаў не заявіў, што ён ні пры якіх акалічнасцях за яе не прагаласаваў бы. І што мне з гэтым шчасцем рабіць? Правесці сямейны з'езд і высунуць маю радасць кандыдатам у прэзідэнты?

«Давайце да гэтага дададзім паказчык перспектывы заваёвы сімпатый выбарцаў. Мілінкевіча не ведае 25% выбарцаў. Някляеў — знак-пытальнік для 58%. Раманчук — для 65% нашых грамадзян абсалютна новая асоба. Вось зараз можна аналізаваць сітуацыю і рабіць высновы, а не проста адпраўляць чытача далей у сацыялогію». Спадзяюся, яшчэ раз спасылацца на жонку няма неабходнасці. Самы «стары твар» у беларускай палітыцы — Партыя БНФ. Па ўзроўню пазнавальнасці ніякая іншая партыя з ёй параўнацца не ў стане. Для многіх беларусаў апазіцыя — гэта БНФ. Іншых партыйных адценняў у агульнай палітычнай палітры яны не адрозніваюць. Але менавіта таму Партыя БНФ стала замыкае рэйтынг-ліст. Тут той жа выпадак, што і з «адзіным беларускім палітыкам», — тыя, хто яго ведаюць, грошай больш не даюць.

***P.S.*** Чарговая «Азбука паліталогіі» блізкая да заваршэння. Мае магчымасці «адпраўляць чытача далей у сацыялогію» вычарпаныя, застаецца толькі адзначыць, што колькасць «прыхільнікаў змен» за апошні год павялічылася ў Беларусі з 48% да 62%. Гэта істотныя змены. Яны адбыліся на фоне памяншэння колькасці рэспандэнтаў, якія адзначылі пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча: у чэрвені 2009-га такіх было 37%, а ў чэрвені 2010 года — 20%. Першы трэнд відавочна супярэчыць другому, але лавіць грамадскую думку на непаслядоўнасці — справа няўдзячная. Яна амбівалентна па сваёй прыродзе, і ўжо хаця б таму простых і адначасова эфектыўных рашэнняў у палітыцы не бывае.

Пры жаданні ў выніковых табліцах сацапытанняў можна знайсці пацверджанне любой папярэдне сфармуляванай выснове. Было б жаданне. Чалавек так уладкаваны, што калі тэст або які-небудзь іншая крыніца інфармацыі — нават гараскоп — спрыяе яму, ён будзе гэтаму верыць з большай ступенню верагоднасцю. Справядліва і адваротная выснова. Мы ўвесь час настроеныя на сігналы, якія пацвярджаюць нашу карціну свету. Гэта не мая выснова. Гэта адна з азбукавых ісцін сацыяльнай псіхалогіі.

РАЗВАЖАННІ

# КОЛЬКІ КАШТУЕ ПЕНСІЯ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Напярэдадні выбараў улады абыходзяць маўчаннем тэму падвышэння пенсійнага ўзросту, пра што неаднойчы казалася рознымі ўпаўнаважанымі людзьмі. Але можна нават не сумнявацца — у выпадку чарговай «элегантнай перамогі» гэтыя планы будуць рэанімаваны. І дададуць яшчэ болей бязглуздзіцы ў нашу і гэтак бязглуздую рэчаіснасць.**

***

Мая бабуля была пенсіянеркай. Ну што ў гэтым дзіўнага? Усе бабулі — пенсіянеркі. Але мая бабуля атрымлівала пенсію не па ўзросце, а па страце карміцеля. Мой дзядзька, яе старэйшы сын, не вярнуўся з вайны, таму дзяржава выплачвала ёй пенсію. У бабулі, якая жыла ў сям'і малодшага сына — у нашай сям'і, — не заўсёды адносіны з маёй мамай былі бясхмарнымі. У такія напружаныя моманты Ева Пятроўна абвяшчала «дзяржаўны суверэнітэт» і дэманстравала намер жыць на сваё.

Таму запомніўся кошт яе суверэнітэту — 18 рублёў, як казалі пасля хрушчоўскай грашовай рэформы 1961 года, «новымі». Пра рэальнае ўтрыманне гэтай сумы можна меркаваць па тым, што мой бацька, які працаваў на торфазаводзе імя Арджанікідзе ў Смалявічах, у сезон прыносіў больш двухсот рублёў у месяц.

Бабуля ў якасці стратэгічнага рэзерву заўсёды мела мяшэчак з цукрам і пакунак з пернікамі. Грашовыя ж зберажэнні трымала загорнутымі ў насоўку. Дробязь раздавала нам, сваім унукам, імкнучыся «па справядлівасці», але і «за добрыя паводзіны».

На вёсцы гэта былі не грошы, а медны грош. Практычна ўсё вясковае насельніцтва ў тыя гады

**ПАМЕРЫ СЯРЭДНІХ ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ У БЕЛАРУСІ І ІНШЫХ КРАІНАХ ЕЎРОПЫ ПА СТАНЕ НА ЛІПЕНЬ 2010 ГОДА (У ДОЛАРАХ ЗША)**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Францыя | 1558,4 |
| 2. | Англія | 1553,8 |
| 3. | Германія | 1337,6 |
| 4. | Чэхія | 513,5 |
| 5. | Польшча | 468,7 |
| 6. | Латвія | 320,3 |
| 7. | Літва | 293,8 |
| 8. | Расія | 255,9 |
| **9.** | **Беларусь** | **155,4** |
| 10. | Украіна | 128 |

працавала ў калгасе, як казалі, «за палачкі». Разлічваліся з калгаснікамі ў канцы года. Капеек наяўнымі мужыкам хапала на некалькі пачак махоркі.

Заробкі выдаваліся збожжам, бульбай, буракамі, саломай. Усё гэта пералічвалася ў рублі для бухгалтарскага і статыстычнага ўліку, каб на чарговым партыйным форуме прадэманстраваць «з лічбамі ў руках» рост дабрабыту калгаснікаў.

Увогуле, галеча была страшная. Таму мая бабуля, якая атрымлівала рэгулярную пенсію, магла на гэтым фоне выглядаць не беднай. А для салдацкіх удоў — ледзь не паловы вясковых жанчын — гэта драбяза была адзінай, хоць і вельмі слабай падтрымкай. Дзецям кніжкі купіць да школы, зладзіць абноўкі. Праца ў калгасе прыбыткаў не давала, галоўнай і адзінай крыніцай выжывання была ўласная гаспадарка.

***

Праца «за палачкі» была працай «амаль задарма». Мне ўдалося дакладна падлічыць памер гэтага «задарма» па мамінай працоўнай кніжцы, якая захавалася ў сямейным архіве. Вылічыў, што мама зарабіла ў калгасе за 43 гады 8045 рублёў «новымі грашыма». У сярэднім не атрымліваецца і 16 рублёў на месяц, калі не лічыць «збожжа жыта, бульбы і саломы», якімі да 1965 года толькі і аплачвалася праца калгаснікаў.

Да 1965 года ўвогуле назва «калгас» прачытвалася ўладамі літаральна — як калектыўная гаспадарка, з чаго вынікала, што калгаснікі павінны самі зарабляць на сябе грошы, пасля таго, як разлічацца за ўсе даброты з дзяржавай. У тым ліку і на пенсіі.

Але ж пераважнай большасці калгасаў ніколі не ўдавалася цалкам разлічыцца з дзяржавай. Таму і было вырашана перавесці іх на гарантаваную грашовую аплату, і далучыць калгаснікаў да кола асоб, пра старасць якіх павінна клапаціцца сістэма сацыяльнага страхавання. Гэта быў крок у развіцці пенсійнай сістэмы дзяржавы «дыктатуры пралетарыяту», якую яе творцы пачыналі з сябе.

Першапачаткова толькі правадыры і кіраўнікі высокага рангу маглі разлічваць на сацыяльную дапамогу, потым гэтае кола пашыралася за кошт адмыслоўцаў, ваенных, нізавых партыйных і савецкіх работнікаў, шараговых працоўных. У 1941 годзе ў СССР пры колькасці насельніцтва больш за 194 мільёна, было ўсяго толькі 4 мільёна пенсіянераў. З іх толькі 200 тысяч — пенсіянераў па старасці. Гэта значыць класічных пенсіянераў, якія не мелі перад савецкай уладай ніякіх іншых заслуг, акрамя адпаведнага працоўнага стажу.

Для параўнання: у сучаснай Беларусі пры насельніцтве меней 10 мільёнаў колькасць пенсіянераў па старасці перавышае 2,6 мільёна.

Пенсійная справа ў краіне становіцца на шырокую нагу толькі ў 1950-я гады, што (у лепшых традыцыях) падаецца як вынік дасягнутых пад кіраўніцтвам партыі і ўраду эканамічных поспехаў і сведчанне іх нястомнага клопату пра рост народнага дабрабыту. А таксама аб'ектыўным дзеяннем асноўнага эканамічнага закона сацыялізму, калі дабрабыт народа рэалізуецца як мэта. Таму шмат хто і не дажываў да пенсіі — праз недахоп жыццёвых сіл.

Калгаснікі ж працавалі без усялякіх пенсій, пакуль вілы ў руках трымаліся. Пасля дажывалі апекай сваякоў ці літасцю Божай. І таму на момант, калі дзяржава вырашыла ўзнагародзіць іх «пенсіямі», лік савецкіх пенсіянераў па старасці сігануў да 16 мільёнаў.

***

Насамрэч пенсійны ўзрост у СССР быў ніжэй, чым у большасці развітых краін. На гэтым нажываўся ладны ідэалагічны капітал. Маўляў, нашы пенсіянеры выходзяць на заслужаны адпачынак цалкам маладымі і здаровымі, а тамтэйшых выпрацоўваюць да поўнага зносу.

Гэтым ганарыліся як доказам несумненўнай перавагі сацыялізму над капіталізмам. На самай жа справе межы пенсійнага ўзросту вызначаліся сярэдняй працягласцю жыцця, а таксама крайнім, вызначаным статыстычнымі метадамі, тэрмінам поўнай страты працаздольнасці. Пераступіўшы яго, працаўнік хварэў настолькі часта, што аплата бальнічных лістоў перавышала памер кошту, створанага яго працай.

Сярэдні савецкі чалавек жыў нашмат менш еўрапейца — і жанчыны, і мужчыны. Асабліва мужчыны. Так што пенсійны тэрмін можна было б і павялічыць (гэта пытанне заўсёды абуджала жывую цікавасць партыйных і дзяржаўных структур), але працягласць жыцця расла не так хутка, як выплаўка чыгуну ці вытворчасць цэменту. А сярод асобных катэгорый яна валілася.

Нават прыняўшы як кіраўніцтва да дзеяння сентэнцыю пра тое, што эканоміка павінна быць эканомнай, нельга было скарачаць колькасць пенсіянераў простым выкрэсліваннем са спісаў тых, хто стаў бы паміраць на вытворчасці па чынніку павелічэння пенсійнага ўзросту.

Цяпер сярэдняя працягласць жыцця мужчын і жанчын яшчэ больш скарацілася. Прычым яна скарацілася і адносна савецкіх паказнікаў, і адносна еўрапейскіх, дзе працягласць жыцця яшчэ павялічылася. Прыкладам, напачатку 1960-х гадоў сярэдняя працягласць жыцця ў Беларусі складала 69 гадоў у мужчын і 77 — у жанчын, што прыкладна адпавядала еўрапейскаму ўзроўню. Зараз сярэдняя працягласць жыцця мужчын і жанчын у Беларусі скарацілася да 68 гадоў, што значна меней, чым у большасці еўрапейскіх краін. Нашмат меней, чым у Польшчы і ў прыбалтыйскіх рэспубліках. Непараўнальна меней, чым у Швейцарыі, Германіі, Францыі ды іншых, дзе людзі ў сярэднім жывуць блізу 80 гадоў.

Зразумела, калі падвысіць пенсійны узрост, то колькасць памерлых, якія не дажывуць да належнага тэрміну, павялічыцца, і сацыяльныя выдаткі скароцяцца. Але перад смерцю людзі пачнуць часцей хварэць, ім трэба будзе выдаваць бальнічныя лісткі, таму сацыяльныя выдаткі падвысяцца.

Ці будзе ў выніку «плюс», ці атрымаецца «мінус», але, безумоўна, палітычныя страты дзяржавы будуць вялікімі, як і агульныя страты грамадства, якому давядзецца перагледзець усе свае погляды на такую з'яву, як звычайная чалавечая страсць. Магчыма, што не атрымаецца забяспечыць нашым старым не толькі годнае дажыванне, але нават і смерць ва ўласным ложку.

Персанальная для мяне няма ніякіх бачных рацый для павялічэння пенсійнага ўзросту. Хоць і лічу, што праўду сказаў колішні расійскі міністр працы і сацыяльнага развіцця Міхаіл Зурабаў: «Сродкаў у пенсійным фондзе досыць, калі мы лічым, што мужчыны ў нас будуць дажываць да 59 гадоў».

Але гэтую досыць горкую праўду трэба прымаць як максіму, якая змушае да карэнных зменаў у сучаснай пенсійнай сістэме.

Каб нашы ці то маладыя, ці то старыя пенсіянеры не выглядалі жабракамі ў параўнанні з іншымі. Бо, працоюць яны не меней за іншых.

БЕСПРАЦОЎЕ

# ЧАГО БАЯЦЦА БЕЛАРУСЫ

Вольга ХВОІН

**Страта працы займае трэцяе месца ў шэрагу сацыяльных фобій беларусаў.**

У чэрвені, паводле апытання Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, кожны трэці рэспандэнт сказаў, што баіцца стаць беспрацоўным. Першынства традыцыйна трымаюць страхі страціць здароўе ці апынуцца ў галечы. Афіцыйнае беспрацоўе ў Беларусі, як падлічылі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, мае твар маладой жанчыны ва ўзросце да 30 гадоў.

Жанчыны ад агульнай колькасці зарэгістраваных беспрацоўных складаюць 53,4%, моладзь ва ўзросце да 30 гадоў — 37,8%, сельскія жыхары — 21,2%. Працягла (больш за адзін год) на ўліку знаходзяцца 17,5% беспрацоўных. Агульная колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на 1 жніўня бягучага года склала 37,8 тысячы чалавек. Гэта на 11,3% менш, чым год таму, і на 2,9% менш, чым на 1 ліпеня 2010 года.

Зарэгістраванае беспрацоўе ў рэспубліцы на канец ліпеня цяперашняга года склала 0,8% ад эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. Самы нізкі паказчык беспрацоўя ў сталіцы — 0,4%. У Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях не працуе 1% эканамічна актыўнага насельніцтва. У Магілёўскай і Мінскай абласцях гэты паказчык складае 0,9%.

Разам з тым эксперты ў галіне працоўных адносінаў гавораць, што рэальны паказчык беспрацоўя можа ў разы пераўзыходзіць афіцыйны. Людзі не надта ахвотна становяцца на ўлік на біржу працы, бо дапамога па беспрацоўю мізэрная — 50,4 тысячы рублёў, або 18,4% бюджэту пражытачнага мінімуму, а клопату многа. Пачынаючы ад абавязкаў рэгулярна адзначацца на біржы працы і да абавязковых работ па ўборцы вуліц ці ўборцы ўраджаю ў саўгасах. Звычайна людзі, якія страцілі працу, самі шукаюць новае рабочае месца ці папросту сядзяць дома. Моцна розніцца сітуацыя з беспрацоўем у сталіцы, буйных гарадах і на перыферыі. У вёсках і маленькіх гарадах


Photo.ByMedia.Net

знайсці кваліфікаваную працу, асабліва маладому спецыялісту, няпроста.

Да слова, адзін з патэнцыйных кандыдатаў на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах эканаміст Яраслаў Раманчук плануе завабіць электарат перадвыбарнай праграмай «Мільён новых працоўных месцаў для Беларусі». Яна прадугледжвае стварэнне спрыяльных умоў для развіцця прадпрымальніцтва і малога бізнесу, больш актыўна прыцягваць у краіну замежныя інвестыцыі, а таксама правесці частковую або поўную прыватызацыю дзяржаўных прадпрыемстваў.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# СЯРГЕЙ МАЦКЕВІЧ


(RFE/RL)

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Па шчырасці, напачатку і я, сярод іншых, памылкова адносіў старшыню Асамблеі няўрадавых арганізацый Сяргея Мацкевіча да сваякоў вядомага палітолага Уладзіміра Мацкевіча. Даводзілася чуць і пра яго роднасныя сувязі з былым кіраўніком КДБ, таксама Мацкевічам. Такое вось знакамітае прозвішча. Як чалавек з добрым пачуццём гумару, Сяргей ніколі не абвяргае такога кшталту памылкі.**

## Сям'я «ворагаў народа»

Сяргей Мацкевіч нарадзіўся 1 жніўня 1964 года ў Пружанах. Менавіта з гэтай датай звязаны эпізод, які даволі красамоўна сведчыць пра ўзровень ведання дзяржаўнымі чыноўнікамі беларускай мовы. Калі яму выдавалі пашпарт, на «рускай» старонцы напісалі «1 августа», а на беларускай — «1 ліпеня».

У 1941 годзе дзеда Сяргея Сільвестра Дзмітрыевіча расстралялі ў Курапатах. Але яму пашанцавала — «недастрэлілі». Пакуль паранены дабіраўся да роднай хаты ў вёсцы Скібічы Драгічынскага раёна, пачалася вайна, а перад гэтым яго жонку, Марыю Андрэеўну, з будучым бацькам Сяргея, «саветы» паспелі выслаць у Барнаул. Вярнуліся толькі ў 1948 годзе.

Калі стала зразумела, што «вайна павярнулася ў другі бок», Сільвестр, хаця і не быў калабарантам, не стаў чакаць, пакуль «саветы» яго заб'юць канчаткова, і «пайшоў на Захад». Недзе ў Польшчы яго схапілі, адправілі ў нямецкі працоўны лагер, дзе дзед і сустрэў канец вайны. Потым быў лагер «фільтрацыйны». Каб не вяртацца ў СССР (шмат хто з такой нагоды абіраў самагубства), назваўся палякам і перабраўся ў Амерыку. У 1986 годзе там і памер.

Дарэчы, пра тое, што ён жывы і знаходзіцца ў ЗША, родныя даведаліся дзякуючы «Голасу Амерыкі», якому дзед распавёў пра свой лёс. Да бацькі Сяргея, на той час студэнта Інстытута народнай гаспадаркі, адразу прыйшлі з КДБ. А іх — яго, дзеда і бацькі — родную хату «рэквізавалі» і перавезлі ў Драгічын яшчэ раней. Нават пасля поўнай рэабілітацыі дзеда ў 1992 годзе, іх сям'я ні прабачэння, ні кампенсацыі не атрымала. Як і мноства іншых. Попел ахвяр сталінскіх рэпрэсій да гэтага часу грукае ў сэрцы нашчадкаў.

Ад падобнай інфармацыі Сяргея аберагалі шчыльна. Каб нічога не ведаў. Каб не пашкодзіць яго жыццю і кар'еры.

## Шлях у жыццё

Ва ўмовах СССР рэдка хто з дзяцінства мэтанакіравана ішоў да сваёй мары. Большасць абірала толькі накірунак руху, а далей усё за іх вырашала дзяржава. Сяргей Мацкевіч спыніў свой выбар на факультэце фізікі БДУ не таму, што жадаў стаць знакамітым вучоным. Папросту дакладныя навукі ў школе яму даваліся лягчэй за гуманітарныя. Многія так робяць і зараз, але ў іх дзеяннях дамінуюць не эмоцыі, а практычнасць і выгода.

У БДУ ён паступіў у 1981 годзе, а ў 1986-м пачаў працаваць на знакамітым «Інтэграле», якому аддаў восем гадоў жыцця. Тыя, хто ведае найноўшую гісторыю, адразу заўважаць, што менавіта на гэты перыяд прыходзяцца найбольш значныя і кардынальныя змены, якія адбыліся ў нашым грамадстве.

Кітайцы не дарэмна лічаць, што жыць падчас нейкіх значных зменаў у грамадстве горш за ўсё, аднак ёсць тут не толькі «мінусы». З аднаго боку, малады спецыяліст не паспеў пазнаць савецкай «стабільнасці», дзе ўсё (да самай пенсіі) было разлічана існуючай уладай. З другога — атрымаў шанец дыхнуць вольным паветрам. Менавіта гэта і дало разуменне таго, што трэба шукаць новае, а не «тупа плыць па цячэнню».

Яшчэ падчас работы на «Інтэграле» Сяргей Мацкевіч скончыў курсы, якія рыхтавалі галоўных бухгалтараў і фінансавых менеджэраў малых прадпрыемстваў. У 1993 годзе звольніўся і рушыў у «свабоднае плаванне».

Акрамя іншага апошнія гады існавання Савецкага Саюзу і самы пачатак фарміравання дзяржаўнай незалежнасці Беларусі адзначаны новай хваляй нацыянальнага адраджэння. Калі да стварэння і дзейнасці «Талакі», «Майстроўні» пакаленне Сяргея Мацкевіча яшчэ «не дарасло», то з Перабудовай надышоў «іх час».

Першы крок Сяргея на гэтым шляху — пераход на беларускую мову. І не ў адзіноце, а разам з жонкай Тамарай, з якой яны пабраліся шлюбам адразу пасля заканчэння БДУ, дзе вучыліся ў адной групе.

**Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у свеце, дзе «за дзейнасць у складзе незарэгістраванай арганізацыі» (не рэгіструюць наўмысна) асуджаны аж 17 чалавек**

Другі, у пэўным сэнсе, быў абумоўлены выпадковасцю. Калі ў 1996 годзе з нашай краіны «выганялі» фонд Сораса, частка яго «бэвушных» кампутараў перадавалася розным грамадскім арганізацыям, у тым ліку і «Супольнасці», якая запрасіла Сяргея Мацкевіча дапамагчы з афармленнем фінансавых дакументаў.

Тамара прыйшла ў «Супольнасць» пазней за мужа і займалася там настаўніцкімі справамі. У хуткім часе гэты накірунак набыў пэўную маштабнасць, і на яго аснове афармілася новая самастойная арганізацыя — Таварыства беларускай школы. І зараз Тамару Мацкевіч больш ведаюць не як сябра «Супольнасці», а як намесніцу старшыні ТБШ. Займаецца яна ў першую чаргу інфармацыйна-метадычным сайтам для настаўнікаў www.*nastaunik.info*.

## Шлях у «трэці сектар»

Грамадскае аб'яднанне «Цэнтр «Супольнасць» было створана ў 1995 годзе. За час існавання новай улады гэта быў пік росту колькасці недзяржаўных структур, якая потым, ад адной чарговай перарэгістрацыі да другой, нязменна зніжалася.

Ад стварэння «Супольнасці» і да 2002 года яе ўзначальваў вядомы палітык Вінцук Вячорка, але пасля прэзідэнцкіх выбараў–2001 і абрання старшынёй партыі БНФ ён прапанаваў на пасаду старшыні Рады Сяргея Мацкевіча. Прыклады, калі нехта з кіраўнікоў пакідае свае пасады па добрай волі, можна пералічыць па пальцах адной рукі. І апазіцыя тут не вельмі адрозніваецца ад улады.

Заўсёды, калі гаворка ідзе пра нейкую арганізацыю, лагічна ўзгадваць пра колькасць сяброў, але на гэты раз зробім выключэнне. Перш за ўсё таму, што звыклыя лічбы тут адпавядаюць рэчаіснасці даволі ўмоўна. Асноўная дзейнасць «Супольнасці» накіравана на кантакты з рознымі рэгіёнамі, пошук і падтрымку лакальных ініцыятываў. Таму мінскі офіс — далёка не ўся структура.

Акрамя таго, шмат хто з сяброў «Цэнтра «Супольнасць», саспяваючы для самастойнай працы, адгаліноўваўся і ствараў асобныя арганізацыі па накірунку сваёй дзейнасці, застаючыся ў партнёрскіх адносінах са сваёй *alma mater*.

Пра ўзаемаадносіны «трэцяга сектару» і палітычных партый сказана і напісана нямала. Асабліва пра тое што, апошнія імкнуцца «кіраваць» усімі формамі грамадскага супраціву. Трэба адзначыць, што час ад часу так і бывае. Асабліва калі ў склад недзяржаўных структур уваходзяць з большасці «чыстыя палітыкі». Гэта не рэдкасць і раней, і цяпер, калі людзі з партбілетамі ў кішэнях знаходзяцца ў складзе адразу некалькіх грамадскіх структур.

З той, аднак, істотнай розніцай, што калі 15–20 гадоў таму НДА ўзнікалі на базе нейкіх палітычна ангажаваных колаў, то апошнім часам яны ўсё больш і больш староняцца падобных стэрэатыпаў. Больш за тое, прынцыпова падкрэсліваюць, што не з'яўляюцца «філіямі» якіх-небудзь палітычных плыняў.

## Шлях у будучыню

Магчыма, прагучыць пафасна, але я прынцыпова лічу, што пэўныя змены ў Беларусі будуць звязаны з узмацненнем грамадзянскай супольнасці. Маю на ўвазе кардынальныя змены, а не касметычныя. На мой погляд, новым уладам удалося павярнуць гісторыю нашай краіны назад перш за ўсё таму, што яны здолелі «падмяць» пад сябе значную частку беларускага грамадства, якое не паспела атрымаць імунітэт ад рознага кшталту папулісцкіх метадаў маніпулявання.

У 2004 годзе Сяргей Мацкевіч быў абраны старшынёй Рабочай групы Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацый (Асамблея НДА). Пасада вельмі падобная да прэзідэнцкай у краінах, якія абралі парламенцкую форму кіравання. У тым сэнсе, што тут сканцэнтраваныя па большай частцы прадстаўнічыя паўнамоцтвы і магчымасці даваць неабавязковыя для выканання парады, а рэальная ўлада знаходзіцца ў іншых. І гэта натуральна, бо ў дадзеным выпадку гаворка не ідзе пра «парасонкавую» структуру. Асамблея — хутчэй «сетка».

Тым, хто вырас у часы «дэмакратычнага цэнтралізму», даволі цяжка зразумець і ўспрыняць такую форму ўзаемадзеяння. У склад Асамблеі НДА на сёння ўваходзіць каля трохсот (пачыналі з дзвюх сотняў) зарэгістраваных і незарэгістраваных грамадскіх арганізацый розных накірункаў дзейнасці. Знайсці тут нейкі агульны назоўнік немагчыма па вызначэнню. Ды і не патрэбна, інакш атрымаецца не «трэці сектар», а нешта вельмі падобнае на тое, што адбываецца на дзяржаўным узроўні.

На жаль, нічога іншага ўладныя «вярхі» не разумеюць. Напрыклад, у красавіку гэтага года яшчэ раз афіцыйна пацвердзілі, што не бачаць ніякага сэнсу ў тым, каб грамадскія дзеячы ўдзельнічалі ў праграмах «Усходняга партнёрства». Маўляў, няма карысці, а супрацоўніцтва магчыма толькі з уладамі і толькі па тых праектах, на якія ёсць іх згода.

Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у свеце, дзе «за дзейнасць у складзе незарэгістраванай арганізацыі» (не рэгіструюць наўмысна) асуджаны аж 17 чалавек.

Каментары, як кажуць, залішнія. Здзіўляе нахрапістасць, з якой дзяржаўныя чыноўнікі адстойваюць свой пункт гледжання.

Такое ўражанне, што грошы ў выглядзе крэдытаў больш патрэбныя не кіраўніцтву беларускай краіны, а самім замежным палітыкам... Ва ўсякім выпадку, той, хто шукае падтрымку, так сябе не паводзіць. Калі хто-небудзь мне прывядзе хоць адзін станоўчы і рэальны (не прапагандысцкі) прыклад так званай «палітычнай лібералізацыі», то я яму буду вельмі ўдзячны.

Дарэчы, Сяргея Мацкевіча ў лістападзе мінулага года ў Бруселі абралі каардынатарам першай платформы (усяго чатыры) Форума грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства» і спікерам гэтай структуры. Створана яна была для таго, каб узмацніць ролю грамадскага сектара ў працэсах «Усходняга партнёрства». Зрабіць яе больш значнай і істотнай.

Іншымі словамі, каб здзейсніць тое, супраць чаго і змагаюцца сучасныя беларускія ўлады. Яны ўвогуле з вялікай насцярожанасцю ставіцца да ўсяго таго, што не створана імі самімі. Нават калі гаворка ідзе пра абсалютную палітычную лаяльнасць. Сітуацыя нагадвае звычайны «чорна-белы» падзел, за якім, як вядома, можа прыйсці і абсалютная цемра. Каб гэтага не было, Сяргей Мацкевіч ужо 14 гадоў і займаецца «трэцім сектарам».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 6 верасня, панядзелак

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Відэафільм АТН «Заступніца зямлі беларускай».
**09.05** Прыгодніцкі фільм «Без нашыйніка» (Украіна).
**10.40** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Варанька» (Расія).
**14.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм «Млын моды-2010».
**15.55** Серыял «Ажаніць Казанову» (Расія).
**16.45** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Серыял «Разлучніца». 1-я серыя.
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Прэм'ера. Серыял «Варанька. Выпрабаванне кахання» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Чартар на Парыж».
**22.10** Баявік «Таямніца «Ордэна» (ЗША).
**00.00** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Малахаў +».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Інкасатары. Стрэл у спіну».
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Асабісты інтэрас».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Канцэрт М.Задорнава.
**15.35** «Зорны рынг».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Мы з будучыні». Расія, 2008 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Крок наперад». ЗША, 2006г.

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Баявік «Інферна» (ЗША).
**12.15** Школа рамонту.
**13.15** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.15** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Тэлебарометр.
**14.55** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Жаночая ліга.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Камедыя «Дайце кнігу скаргаў» (СССР).
**20.45** Калыханка.
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.05** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 1-я серыя.
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** «У агнядышнай лаве кахання. Святлана Святлічная». Дакументальны фільм.
**12.15** Фільм «Свая чужая сястра».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**20.25** Тэлесерыял «Дыхай са мной». 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.35** «Дзяжурны па краіне».

НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Мама ў вялікім горадзе».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.45** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Першая перадача» Аўтамабільная праграма.
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны баявік «Марскія д'яблы».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.55** Моладзевы серыял «Школа».

EUROSPORT

**04.00, 06.00, 08.00, 10.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 7.
**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**12.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**12.45** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Нюрбургрынг (траса/Германія).
**13.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Нюрбургрынг (траса/Германія). Гонка 2.
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Ошэрслебен (Германія).
**14.30** Мотаспартыўны часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 1.
**17.45** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**18.15, 20.10, 02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 8.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Вагон.
**07.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Пірацкі смак».
**08.05** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.20** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**09.05** Басанож на свеце: «Бушмены».
**09.30** Дак. гадзіна: «Бронзавы жаўнер Алёша», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**10.35** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 10 серыя.
**11.20** Фільматэка майстроў: «Пасля канца свету», маст. фільм, 1998 г., Балгарыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**17.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 10 серыя.
**18.20** Госць «Белсату»: Галіна Васько.
**18.35** «Транзіт», дак. фільм, Румынія.
**19.10** Прэс-экспрэс (паўтор).
**19.30** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння (паўтор).
**20.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пасол Спасоўскі», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Пасля канца свету», маст. фільм, 1998 г., Балгарыя.
**23.30** Аб'ектыў (паўтор).

## 7 верасня, аўторак

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Серыял « Варанька. Выпрабаванне кахання « (Расія). 1-я серыя.
**09.55** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Разлучніца» (Расія). 1-я серыя.
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Чартар на Парыж».
**12.10** Меладрама «Родныя і блізкія».
**14.05** Відэафільм «Млын моды-2010».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм «Млын моды-2010».
**15.55** Камедыйны серыял «Ажаніць Казанову» (Расія). Заключная серыя.
**16.45** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Серыял «Варанька. Выпрабаванне кахання» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Крымінальная камедыя «Такое жыццё» (Італія).
**00.00** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША). Заключная серыя.
**00.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Малахаў +».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** «Хай кажуць».
**20.00** Нашы навіны.
**20.20** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Беларусь-Румынія. Прамая трансляцыя. (У перапынку - «Навіны спорту»).
**22.25** Прэм'ера. «Хімік». Шматсер. фільм.
**23.30** Нашы навіны.
**23.45** Навіны спорту.
**23.50** «Першае каханне».
**00.50** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Нашы навіны.
**01.50** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Мы з будучыні». Расія, 2008 г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Next 3». Серыял. Закл. серыя.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.20** Фільм «Таямнічая выспа». Украіна.

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 1-я серыя.
**11.45** «Запал па культуры».
**12.25** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**13.25** Мультсерыял «Доктар Дог».
**13.40** Пазакласная гадзіна.
**13.50** Простыя практыкаванні (Расія).
**14.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**15.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.20** Жаночая ліга.
**16.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**17.55** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы U-21. Беларусь - Азербайджан. Прамая трансляцыя.
**19.55** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 2-я серыя.
**20.45** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.55** «Спорт-кадр».
**23.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Вялікія прарочыцы. Ванга і Матрона». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Рускі «Тытанік». Дажыць да світання». Дакументальны фільм.

НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.45** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Баявік «Марскія д'яблы».
**21.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.55** Моладзевы серыял «Школа».

EUROSPORT

**04.00, 06.00, 08.00, 10.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 8.
**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**13.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**13.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Нюрбургрынг (траса/Германія). Часопіс.
**14.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 2.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 10.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 9.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 9.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 9.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату»: Галіна Васько.
**08.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пасол Спасоўскі», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**09.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.25** «Транзіт», дак. фільм, Румынія.
**09.55** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**10.20** «Познань'56», маст. фільм, Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 1 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** Моўнік (паўтор).
**18.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «У Афрадыты са смакам».
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Пачатак канстытуцыйнага права ў Беларусі».
**19.20** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.30** Праект «Будучыня» (паўтор).
**20.00** «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г.
**20.30** Вагон.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 1 серыя: «Прашу галасаваць за мяне.
**22.30** YoLife! (моладзевая праграма): «Цырк».
**22.45** «Доктар Марцін», серыял, 2004 г., Вялікабрытанія.
**23.30** Аб'ектыў (паўтор).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 8 верасня, серада

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Варанька. Выпрабаванне кахання» (Расія). 2-я серыя.
**10.00** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**12.10** Меладрама «Свой-чужы» (Расія).
**14.05** Здароўе.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм «Млын моды-2010».
**15.55** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Серыял «Варанька. Выпрабаванне кахання» (Расія). 3-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Серыял «Апостал» (Расія).
**23.00** Моладзевы баявік «Без тормазаў».
**01.00** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Малахаў +».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Апантаны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «Хімік». Шматсер. фільм. Закл. серыя.
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** Асяроддзе пасялення. «Дарункі восені».
**00.40** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35, 21.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**22.55** «Дабро пажалiцца».
**23.20** Фільм «Руская гульня». Расія, 2007г.

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 2-я серыя.
**11.40** «Спорт-кадр».
**12.10** Камедыйны серыял «Венера і Апалон» (Францыя). 1-я серыя.
**13.05** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.00** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Жаночая ліга.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Музычная камедыя «Волга-Волга».
**20.55** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.15** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 3-я серыя.
**23.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Чалавек, які вынайшаў тэлевізар». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Кулагін і партнёры».
**11.55** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Па той бок жыцця і смерці. Рай». Дакументальны фільм.

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.45** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.15** «Вочная стаўка».
**12.10** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.05** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Баявік «Марскія д'яблы».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.55** Моладзевы серыял «Школа».

**04.00, 06.00, 08.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 9.
**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**10.00** Снукер. Мастэрс (Кітай). Дзень 3.
**12.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Боснія і Герцагавіна - Францыя.
**13.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Швейцарыя - Англія.
**14.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 3.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 11.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/4 фіналу.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «У Афрадыты за смакам».
**08.30** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Канстанцін Астрожскі і бітва пад Воршаю».
**08.40** «Бізнес-партыя», рэпартаж, Польшча.
**09.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.10** Беларусы ў Польшчы.
**09.25** Вагон.
**09.35** «Бульбаны», мультсерыял.
**09.45** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**10.10** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Прашу галасаваць за мяне».
**11.10** YoLife!: «Цырк».
**11.25** «Доктар Марцін», серыял: 1 серыя.
**12.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 1 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**17.35** Доктар Марцін», серыял: 1 серыя.
**18.35** «Катынь. Праўда і хлусня пра злачынства», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Канстанцін Астрожскі і бітва пад Воршаю».
**19.30** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.40** На колах (паўтор).
**20.10** Басаног па свеце (спазнавaўчая праграма): «Мехіка – горад з мінулым».
**20.40** Госць «Белсату»: Галіна Васько.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Малыя і сярэднія фірмы Еўразвязу».
**21.40** Без рэтушы: «Чарнобыльскі шлях прафесара Бандажэўскага», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**22.00** «Застава», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Сербія і Чарнагорыя–Боснія і Герцагавіна–Македонія–Славенія–Харватыя.
**23.30** Аб'ектыў (паўтор).

## 9 верасня, чацвер

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Серыял «Варанька. Выпрабаванне кахання» (Расія). 3-я серыя.
**10.00** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**12.10** Меладрама «Толькі вярніся» (Расія).
**13.50** Дак. цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм «Планета гольфу: ААЭ».
**15.55** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.55** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**18.50, 01.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Серыял «Варанька. Выпрабаванне кахання» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Вострасюжэтны серыял «Апостал» (Расія). 2-я серыя.
**23.15** Баявік «Кантрабандысты» (Германія-Швейцарыя).
**01.10** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Малахаў +».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Апантаны». Шматсер. фільм.
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.10** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.20** Фільм «Гарачы лістапад». Расія, 2006 г.

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 3-я серыя.
**11.45** «Бітва экстрасэнсаў».
**12.40** Камедыйны серыял «Венера і Апалон» (Францыя). 2-я серыя.
**13.30** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.25** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Жаночая ліга.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Тарпеда (Ніжні Ноўгарад). Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.20** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**23.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** Час футболу.
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Крызісы. Прадказанні Прарока». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Кулагін і партнёры».
**11.55** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** Прэм'ера. «Паядынак».

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.45** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Крамлёўскія жонкі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Баявік «Марскія д'яблы».
**21.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.55** Моладзевы серыял «Школа».

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**06.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/4 фіналу.
**08.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**10.00** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 4.
**12.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/4 фіналу.
**14.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 4.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 12.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Малыя і сярэднія фірмы Еўразвязу».
**08.05** Госць «Белсату»: Галіна Васько.
**08.25** Без рэтушы: «Чарнобыльскі шлях прафесара Бандажэўскага», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**08.45** «Катынь. Праўда і хлусня пра злачынства», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**09.25** Басаног па свеце (спазнавaўчая праграма): «Мехіка – горад з мінулым».
**09.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Канстанцін Астрожскі і бітва пад Воршаю».
**10.00** «Тры шалёныя нулі» (Trzy szalone zera), тэлесерыял: 3 серыя.
**10.25** Доктар Марцін», серыял: 1 серыя.
**11.10** «Панна Ніхто», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял.
**17.35** «Застава», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Сербія і Чарнагорыя–Боснія і Герцагавіна–Македонія–Славенія–Харватыя.
**19.10** Паляванне на дзівосы (паўтор).
**19.30** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** Басаног па свеце: «Бушмены».
**20.30** Хто ёсць кім?: «Лідэркі», рэпартаж.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Форум (ток-шоу): «Беларускія альфонсы: адкуль яны?»
**22.40** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**23.25** Аб'ектыў (паўтор).

## 10 ВЕРАСНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Варанька. Выпрабаванне каханнем» (Расія).4-я серыя, заключная.
**09.55** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.50** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Іранічная меладрама «Мужчынская інтуіцыя» (Расія).
**14.05** «OFF STAGE LIFE».
**14.20** Відэафільм АТН «Храм памяці».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Ангеліна» («Белвідэацэнтр»).
**16.10** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 3-я серыя.
**17.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Прэм'ера. Серыял «Варанька. Насуперак лёсу» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Рэспубліканскі дзіцячы конкурс «Песня для Еўрабачання-2010». Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.35** Прэм'ера. Дакументальна-музычны фільм «Роўлінг Стоунз. Хай будзе святло» (ЗША - Вялікабрытанія).
**01.50** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Малахаў +».
**12.15** «Чакай мяне». Беларусь.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Летні кубак.
**23.25** Фільм «Рэстлер».
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Прэмія Дарвіна». ЗША, 2006 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «І грымнуў гром». Германія-Вялікабрытанія-ЗША-Чэхія, 2005г.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.10** Ваенна-прыгодніцкі баявік «СМЕРШ» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**12.10** Камедыйны серыял «Венера і Апалон» (Францыя). 3-я, 4-я серыі.
**13.55** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.55** Мультсерыял «Доктар Дог».
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дакументальны фільм «Гэты дзіўны свет» (Беларускае тэлебачанне).
**19.35** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.20** Калыханка.
**20.40** Тэлебарометр.
**20.45** «Бітва экстрасэнсаў».
**21.45** Моладзевая камедыя «Дзяўчынка ў хлопчыку. Хлопчык у дзяўчынцы» (Вялікабрытанія-Канада).
**23.30** «Пра мастацтва».
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).

---

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Перапыненае маўчанне. Муслім Магамаеў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Кулагін і партнёры».
**11.55** Тэлесерыял «Дыхай са мной». 2010 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** Прэм'ера. «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**20.25** Фільм «Я падарую сабе цуд». Расія.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Камедыя «Шэкспіру і не снілася…». Расія, 2007 г.
**00.40** «Перапыненае маўчанне. Муслім Магамаеў». Дакументальны фільм.

---

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Руская сенсацыі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Лепшы горад Зямлі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Нтвшнікі».
**22.10** Прэм'ера. Фільм «Грамадзянка начальніца».
**00.00** Трылер «Лядзяш».

---

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**10.00** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 5.
**12.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**14.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 5.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 13.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**20.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**01.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**01.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.

---

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Форум (ток-шоу): «Беларускія альфонсы: адкуль яны?»
**08.35** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**08.50** Хто ёсць кім?: «Лідэркі», рэпартаж.
**09.05** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**09.35** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Бушмены».
**10.00** «100 хвілін вакацыяў» (Sto minut wakacji), тэлесерыял: 1 серыя.
**11.25** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 10 серыя.
**12.15** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 5 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял, 2003 г., Польшча.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 10 серыя.
**18.20** Форум (ток-шоу): «Святая лічба».
**19.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Малыя і сярэднія фірмы Еўразвязу».
**19.25** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 1 серыя: «Прашу галасаваць за мяне».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Царква на мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**22.10** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, 1981 г., Францыя.
**23.35** Аб'ектыў (паўтор).

## 11 ВЕРАСНЯ, СУБОТА

---

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.15** Здароўе.
**09.45** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія).
**10.40** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Прыгодніцкая камедыя «Белае сонца пустэльні» (СССР).
**13.45** Дакументальны цыкл «Невядомая версія. «Белае сонца пустэльні» (Украіна).
**14.35** Зона Х. Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**17.10** Адмысловы рэпартаж АТН «Знайсці кнігу».
**17.25** Відэафільм АТН «Зямля беларуская. Вытокі».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Славянскі базар у Віцебску-2010». Майстры мастацтваў Беларусі.
**21.00** Панарама.
**21.40** «White Concert».
**23.10** Баявік «Асабісты нумар» (Расія-Італія).

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Ералаш».
**11.30** Фільм «Гранатавы бранзалет».
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** Камедыя «Страхавы агент».
**15.00** Прэм'ера. «Герман Цітоў. Першы пасля Гагарына».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Ларыса Доліна. «Мне надакучыла быць жалезнай».
**17.20** Камедыя «Дзіця напракат».
**18.55** Асяроддзе пасялення.
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Дэтэктар хлусні».
**22.10** Прэм'ера. «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.45** Фільм «Джэры Магуайр».
**01.05** Праграма «Ціхі дом» на Венецыянскім кінафэсце.

---

**06.35** «Вовачка». Камедыйны серыял. Заключныя серыі.
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Фільм «Як я быў вундэркіндам». СССР, 1983 г.
**09.55** «Мінск і мінчане».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Новыя падарожжы дылетанта».
**11.10** «Крокі да поспеху».
**12.05** Фільм «Нашы суседзі». Беларусьфільм, 1957 г.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Фільм «Давай ажэнімся». Беларусьфільм, 1982 г.
**15.20** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Рыфмуецца з каханнем». Беларусь, 2006 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Прэм'ера!»: Фільм «Трамвай у Парыж». Беларусь, 2010 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Зорны рынг».
**23.55** Фільм «Інсайт». Беларусь, 2009 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.30** Усё аб бяспецы.
**07.55** Нашы тэсты.
**09.00** Жаночая ліга.
**09.30** «Рэальны свет».
**10.00** Жансавет.
**10.40** «Ты - тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
**11.20** Тэлебарометр.
**11.25** «Запал па культуры».
**12.05** Дэтэктыўная меладрама «Блізкія людзі» (Расія). 1- 4-я, заключная, серыі.
**16.05** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Лакаматыў (Яраслаўль). Прамая трансляцыя.
**19.15** «Восеньскі жарт з...». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.50** Тэлебарометр.
**19.55** Прыгодніцкі фільм «Сутычка ў небе» (ЗША).
**21.50** Крымінальны трылер «Анёл» (Францыя).
**23.55** Жывы гук.

---

**07.00** Фільм «Прызначэнне».
**08.30** Камедыя «Шэкспіру і не снілася…». Расія, 2007 г.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Я падарую сабе цуд». Расія, 2010 г.
**13.30** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** Прэм'ера. «Другі. Герман Цітоў». Дакументальны фільм.
**15.05** Дэтэктыў «Пятроўка, 38».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Гарадок». Дайджэст.
**20.15** Прэм'ера. Фільм «Пастка». 2009 г.
**23.40** Фільм «Жанаты халасцяк».
**01.10** Прэм'ера. «33 вясёлыя літары».

---

**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Камедыя «Пра каханне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Крымінальная драма «Кароль мурашак».

---

**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**10.00** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 1/2 фіналу.
**12.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**14.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 1/2 фіналу.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 14.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/2 фіналу.
**01.00** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях». Этап 1.
**01.15** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**02.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.

---

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Невядомая Беларусь: «Царква на мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**08.30** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Малыя і сярэднія фірмы Еўразвязу».
**08.45** Форум (ток-шоу): «Святая лічба».
**09.20** «Чароўнае дрэва», серыял.
**09.45** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**10.25** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Прашу галасаваць за мяне».
**11.25** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, 1981 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.00** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія.
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.20** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «У краі духаў».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.30** Суботні сеанс: «Матадор», маст. фільм, 2005 г., ЗША–Ірландыя–Германія.
**23.05** Аб'ектыў (паўтор).

## 12 ВЕРАСНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**08.15** Мультфільмы.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.50** «OFF STAGE LIFE».
**11.05** Дакументальны цыкл «Невядомая версія. «Службовы раман» (Украіна).
**12.10** Меладраматычная камедыя «Службовы раман» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Зямля беларуская. Скрыжаванні».
**15.55** Прэм'ера. Сямейны фантастычны мультфільм «Астрабой» (Ганконг-ЗША-Японія).
**17.30** Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.05** Суперлато.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.05** Вострасюжэтны дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя» (Расія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** Камедыя «Апякун».
**13.25** Фільм «Лера».
**15.05** «Мой радавод».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Сталінград».
**17.15** Фільм «Масква слёзам не верыць».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Арлет».
**22.55** Прэм'ера. Фільм «Скульптар смерці».
**00.35** Прэм'ера. «Yesterday live».

**07.00** «Вовачка - 2». Камедыйны серыял.
**07.55** Фільм «Прэмія Дарвіна». ЗША, 2006 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Белыя росы». Беларусьфільм, 1983 г.
**15.30** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Днепр» (Магілёў) - ФК «Мінск». Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «На спіне ў чорнага ката». Беларусьфільм, 2008 г.
**22.25** СТБ прадстаўляе: Жывы канцэрт.
**23.15** Фільм «Зграя». Беларусьфільм, 2008 г. Серыял.
**01.00** «Сакрэтныя матэрыялы».

**07.25** Дабравест.
**07.50** Мір вашай хаце.
**08.00** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.25** Нашы тэсты.
**09.30** Жаночая ліга.
**10.00** Школа рамонту.
**11.05** Медычныя таямніцы.
**11.50** Тэлебарометр.
**11.55** «Ты - тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
**12.30** «Правы чалавека».
**12.45** Гаспадар.
**13.15** Камедыя «Верныя сябры» (СССР).
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Эвертан - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**17.25** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**18.15** Дакументальны цыкл «Невераготныя гісторыі кахання» (Украіна).
**19.05** Драма «Час суніцаў» (Расія).
**20.55** Тэлебарометр.
**21.15** Смешная часіна.
**21.45** Культасвет.
**22.15** Баявік «Крытычная маса» (ЗША).

РОССИЯ

**07.00** «Здабыткі рэспублікі».
**07.30** Дэтэктыў «Пятроўка, 38».
**09.15** Фільм «Жанаты халасцяк».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Памятаць або забыцца».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** Фільм «Пастка». 2009 г.
**18.05** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Сумленны дэтэктыў».
**20.45** Прэм'ера. Фільм «Калі б я цябе кахаў...». Расія, 2010 г.
**22.50** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.50** Фільм «Апошні забой».

НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Крамлёўскія жонкі».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Лепшы горад Зямлі».
**14.25** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.00** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**23.55** «Футбольная ноч».
**00.20** «Асабліва небяспечны!».

EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.
**09.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**09.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень Фінал.
**12.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**12.15** Аўтаспорт. Серыя Гран-пры 3. Монца (Італія). Гонка 2.
**12.45** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ. Монца (Італія).
**13.30** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Сільверстоун (Вялікабрытанія).
**14.45** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень Фінал.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 15.
**18.45** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Сільверстоун (Вялікабрытанія).
**20.00** Матаспартыўны часопіс.
**20.15** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень Фінал.
**21.30** Матаспартыўны часопіс.
**21.45** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях». Этап 2.
**22.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.
**23.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. Фінал.
**02.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.05** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**08.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «У краі духаў».
**08.55** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 3 серыя: «Замаховец».
**09.40** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**10.10** «Арол: крымінальная сага», серыял: 1 серыя.
**11.05** «Матадор», маст. фільм, 2005 г., ЗША–Ірландыя–Германія.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Рэмарка (культурніцкая праграма) (паўтор).
**17.45** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 11 серыя.
**18.30** «Цягнік стаіць пяць хвілінаў», дак. фільм, 2009 г., Літва.
**19.30** «Маўрыцы і Гаўранэк», мультсерыял.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Бонна Сфорца».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.00** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Паляванне з бушменамі».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Вельмі салёны смак».
**21.55** Фільматэка майстроў: «Мядзведзік», маст. фільм, 2007 г., Чэхія.
**23.35** Тыдзень у «Аб'ектыве» (паўтор).


# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня
Всего

Кассир

# Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# АПОШНІ САМАЗВАНЕЦ

Алег ПЯТРОЎ

**18 жніўня ў Барселоне памёр Карлас Уга, прадстаўнік вядомага арыстакратычнага роду Бурбонаў Пармскіх, былы галоўны канкурэнт цяперашняга іспанскага караля Хуана Карласа ў барацьбе за іспанскі трон.**



У біяграфія нябожчыка нават чалавек, які слаба ведае гісторыю Іспаніі, знойдзе шмат парадоксаў. Па-першае, Карлас Уга напросту па факту нараджэння ў сям'і Бурбонаў Пармскіх стаў адным з лідэраў руху карлістаў. Карлісты — прыхільнікі адной з галінаў бурбонскай дынастыі, якія лічылі, што іспанская карона павінна належаць прадстаўнікам іхняга роду. У XIX стагоддзі карлісты тройчы ўздымалі маштабныя паўстанні (адно з іх знесла жыцці 200 тысяч чалавек), каб пасадзіць на трон «легітымнага» караля. Спробы змены дынастыі ў той ці іншай форме працягваліся фактычна да пачатку 1980-х гадоў.

Пры гэтым піянеры карлісцкага руху былі не проста манархістамі. Гэта былі жалезабетонныя рэакцыянеры, якія марылі вярнуць Іспанію ў часы інквізіцыі і абсалютызму. Нянавісць карлістаў да прагрэсу была настолькі вялікай, што на захопленых імі тэрыторыях разбуралася чыгунка і знішчалася тэлеграфная сувязь.

Калі ў 1930-я гады да ўлады ў Іспаніі прыйшлі левыя партыі, карлісты аўтаномна ад Франка пачалі рыхтаваць свой антырэспубліканскі мяцеж. Пасля канчатковай перамогі Франка ў грамадзянскай вайне Ксаўер настолькі паслядоўна змагаўся з рэспубліканцамі, што ўсе лічылі: вакантная на той час іспанская карона ў яго ў кішэні. Дасюль не зразумела, чаму Франка ў 1962 годзе вырашыў прызначыць каралём не Ксаўера, а Хуана Карласа — прадстаўніка іншай лініі Бурбонаў. Інакш менавіта Карлас Уга пасля смерці Франка стаў бы кіраўніком дзяржавы. Якой бы ў такім выпадку была гісторыя іспанскай трансфармацыі — пераход ад дыктатуры да дэмакратыі?

Карлас Уга нарадзіўся ў 1930 годзе ў Парыжы. Яго дзяцінства прыйшлося на часы крызісу Трэцяй рэспублікі і фашысцкай акупацыі. Нягледзячы на арыстакратычны тытул яго бацька, які па дамове з Франка жыў у Францыі, Ксаўер актыўна ўключыўся ў антыгітлераўскі супраціў. Гэта прывяло да арышту і нават адпраўкі ў канцэнтрацыйны лагер Дахау, адкуль яго вызвалілі саюзнікі.

Калі ўсё ж апярэдзіў, карлістам давялося змагацца пад яго кіраўніцтвам. Каб хутчэй паканчыць з рэспублікай, яны нават вырашылі распусціць сваю арганізацыю Карлісцкая Грамада і разам уступілі ў франкісцкую партыю Іспанская Фаланга. І вось такой публіцы Карлас Уга змог у 1960-я гады навязаць ідэі сацыялізму і дэмакратыі.

Карлас Уга быў сынам Ксаўера Бурбона Пармскага. Падчас

Што да маладога Карласа Уга, ён пасля вайны закончыў Оксфард і працаваў у кіраўніцтве Нямецкага банку над праграмай эканамічнай рэканструкцыі Германіі.

Між тым, Ксаўер па-ранейшаму ўпарта змагаўся за тое, каб Франка прызначыў яго каралём (аднаўленне манархіі было адным з лозунгам фашысцкага мяцяжу). Франка не надта актыўнічаў. Тады Ксаўер пайшоў на незвычайны крок: у 1952 годзе ў аднабаковым парадку абвясціў сябе каралём. Улады, аднак, не адрэагавалі на падобную ініцыятыву.

У 1956 годзе кароль-самазванец выклікаў да сябе сына і даручыў яму важную місію — стварыць у Іспаніі падпольную сетку карлістаў. Карлас Уга, які ў вачах карлістаў цяпер быў наследным прынцам, паставіўся да задання з сапраўдным энтузіязмам. Каб даведацца пра жыццё простых іспанцаў ён нават уладкаваўся працаваць на шахты ў Андалузіі. Адначасова ён працаваў з гурткамі карлістаў, якія адмовіліся інтэграваца ў дзяржаўныя фашысцкія структуры.

Франка спачатку заплюшчваў вочы на дзейнасць Карласа Уга і нават даў яму асабістую аўдыенцыю. Аднак пазней, у 1968 годзе, дэпартаваў яго разам з бацькам і ўсёй сям'ёй. На той час Карлас Уга быў шлюбе з галандскай княгіняй Ірэнай. Ад гэтага шлюбу нарадзілася чатыры дзіцяці, якія адразу атрымалі арыстакратычныя тытулы.

У эміграцыі Карлас Уга не склаў рукі. Ён працягваў барацьбу за трон. У 1972 годзе ім ствараецца Партыя Карлістаў. Адначасова праграма карлістаў радыкальна мяняецца. Яны пераходзяць у апазіцыю да Франка. Стары карлісцкі лозунг: «Радзіма, Бог і Кароль» замяняецца на «Свабода! Сацыялізм! Федэралізм! Самакіраванне!». Вялікую ролю для ідэйнай перазагрузкі карлістаў мелі матэрыялы Другога Ватыканскага Сабору.

Дарэчы, пры Партыі Карлістаў існавала нават баявая арганізацыя — Група карлісцкага дзеяння, якая змагалася з дыктатурай метадамі тэрору.

Праўда, частцы карлістаў гульня Карлас Уга з левай рыторыкай не спадабалася. Яны адрадзілі правую Карлісцкую Грамаду.

У 1975 годзе Ксав'ер Першы аддаў Богу душу. Карона перайшла да Карласа Уга. У гэты час пачынаецца новая рашучая фаза ягонай барацьбы за пасад. У Іспаніі памёр Франка, уладу наследаваў кароль Хуан Карлас. Лідэр карлістаў аператыўна вылецеў на радзіму. Аднак далей аэрапорта паліцыя Карласа Уга не пусціла, а пасля яго ўвогуле адправілі назад у Францыю.

Толькі ў 1978 годзе, калі аўтарытэту Хуана Карласа нічога не пагражала, той пагадзіўся пусціць родзіча-канкурэнта ў краіну. Нават прыняў яго на афіцыйным узроўні. Карлас Уга, аднак, не адмовіўся ад ідэі пераехаць у рэзідэнцыю іспанскіх манархаў. Наш герой з галавою пагрузіўся ў палітыку: на носе былі парламенцкія выбары 1979 года. Ён балатаваўся ў парламент у правінцыі Навара, якая ў часы бунтаў карлістаў была бастыёнам іхняга руху. Аднак у выніку старшыня партыі карлістаў прайграў. За кандыдата з роду Бурбонаў Пармскіх прагаласавала 7 працэнтаў.

Фіяска прымусіла Карласа Уга пераглядзець планы. Ён адмовіўся ад пасады старшыні партыі. З'ехаў працаваць прафесарам у Гарвард. Свае апошнія гады ён правёў у Бруселі. 18 жніўня гэтага года закончылася жыццё манарха — сацыяліста і апошняга прэтэндэнта на іспанскі трон ад лагеру карлістаў.

Хаця, можа, і не апошняга. Магчыма, які-небудзь з яго нашчадкаў захоча зноў паспрачацца за карону. Прынамсі Карлас Уга ніколі публічна не адмаўляўся ад манархічных прэтэнзій. Праўда, зрабіць дынастычны пераварот зараз будзе цяжка. На апошніх парламенцкіх выбарах Партыя Карлістаў атрымала па ўсёй краіне 2030 галасоў. Гэта складае 0,01 працэнтаў галасоў выбарцаў.



Прынц Карлас Уга дэ Бурбон Пармскі

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Галоўная праблема Лукашэнкі — дзе ўзяць грошы. Расія выдачу датацый скараціла вельмі рэзка. Еўропа таксама грошай больш не дае, не дачакаўшыся сто разоў абяцаных палітычных і эканамічных рэформаў. Грашыма МВФ пакарыстацца нельга, паколькі Мінск адмаўляецца прымаць умовы, на якіх МВФ згодны дапамагаць. Кітай, здаецца, гатовы даць грошы — амаль 15 мільярдаў, але гэта будуць мэтавыя крэдыты, яны, фактычна не заходзячы ў краіну, сыдуць на аплату кітайскіх тавараў. У кастрычніку Лукашэнка павінен ехаць у Іран — адкрываць сумесную іранска-беларускую здабычу нафты на радовішчы Джафір. За гэту танную нафту Мінску давядзецца заплаціць далейшым пагаршэннем сваіх пазіцый: міжнародных санкцый супраць Ірану пакуль быццам бы ніхто адмяняць не збіраецца. Так што прэзідэнт Лукашэнка на вачах трапляе ў поўны цугцванг. І нават легітымнасць яго ўсё яшчэ верагоднай перамогі на хутркіх выбарах гэтым разам ужо не будзе прызнаная нікім, акрамя, магчыма, Чавеса і Ахмадзінежада. А ім — пры ўсім жаданні — не пратрымаць лукашэнкаўскі рэжым на плаву.

**«Вести» (Расія)**

У стаўленні да Беларусі варта дзейнічаць асцярожна, хоць апошнія гады паказалі, што дыялог з Мінскам — лепш, чым санкцыі і ізаляцыя. Пры гэтым кантакты з уладай не павінны азначаць адмову ад падтрымкі апазіцыі, нягледзячы на тое, што ў блізкай перспектыве яе шанцы прыйсці да ўлады невялікія. Аляксандр Лукашэнка спрабуе вызваліцца ад Расіі, збліжаючыся (прынамсі ў эканамічным плане) з ЕС. Гэты працэс трэба падтрымліваць, са спадзяваннем, што з часам ён прывядзе да глыбейшых змен у Беларусі, аднак не настолькі, каб стаць гарантам палітыкі Лукашэнкі ў стаўленні Еўропы. Прапанаваны экспертамі прынцып умоў пры падтрымцы Беларусі (дапамога ў абмен за пэўныя крокі, якія паляпшаюць функцыянаванне праваой дзяржавы і гарантыі грамадзянскіх свабод) з'яўляецца самай лепшай стратэгіяй.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

Знявага прыватнай ініцыятывы — гэта філасофія, якую прызнае сам Лукашэнка, і яе добра засвоілі службоўцы. Моцны бізнес можа апынуцца самастойным і пачне ўяўляць сабой пагрозу для яго неабмежаванай улады. Бюракратызм у адносінах з інвестарамі расце на гэтай жа глебе. Будучы фактычна дзяржаўнымі службоўцамі, беларускія дырэктары не здольныя на прадпрымальніцкую рызыку, без якой няма развіцця. Любога прыватнага біязнесмена ў краіне ўспрымаюць як ворага, а інвестару дыктуюць умовы, як і ў што яму ўкладваць грошы, па якім кошце і каму прадаваць прадукцыю. Лагічна, што ў Беларусь не толькі не ідзе замежны бізнес, але і родны пакідае межы краіны. Па інфармацыі лідэра аб'яднання «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва» Віктара Гарбачова, за апошнія сем гадоў з краіны з'ехалі 52 тысячы прадпрымальнікаў, а кожны пяты з тых, хто застаўся, працуе ў цяню.

**«Независимая газета» (Расія)**

Агітацыя Крамля за справядлівыя і дэмакратычныя выбары ў Беларусі напярэдадні выбарчага цыклу ў самой Расіі, у якім уладзе патрэбныя прадказальныя вынікі, можа справакаваць цалкам непатрэбныя ёй тэндэнцыі да мадэрнізацыі палітычнай сістэмы. І таму Масква, мабыць, давядзецца і надалей сябраваць з тым, каго яна вырасціла. Знайсці вінаватых за паказ абразлівых фільмаў, знізіць кошты на газ і ў адзіночку «актывізаваць адносіны» з Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй. Час канчатковага выбару яшчэ не прыйшоў.

**«Ведомости» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КАЗАХСТАН. НАШТО КАЗАШКАМ ЗУБЫ?



Сапраўдны скандал выклікаў у казахскім сегменце інтэрнэту артыкул, прысвечаны праблемам мясцовай стаматалогіі, а дакладней, адзін каментар да яго. Сама публікацыя (яна з'явілася на сайце казахскай службы «Радыё Свабода») распавядала пра такую негатыўную масавую з'яву, як адсутнасць зубоў у казахскіх жанчын. У шмат каго ў роце толькі карэньчыкі. Прычына — дрэнная ежа. А на пратэзы грошай няма. Здавалася, матэрыял як матэрыял. Аднак першы каментар да яго нейкага Каната паставіў усіх на вушы. Канат сцвярджае, што адсутнасць зубоў у жанчын — гэта вяртанне да казахскай традыцыі. Быццам у часы, калі казахі былі нацыяй намадаў, у казашак таксама не было зубоў. Каб аргументаваць свой тэзіс, аўтар каментара спасылаецца на традыцыі іншых народаў. Так, у Афрыцы дзядзька нявесты ў дзень шлюбу выбівае ёй пярэднія зубы. Нацыяналісты пабачылі ў каментарах Каната правакацыю супраць нацыянальнай гісторыі і пачалі даказваць, што да з'яўлення ў краі стаматалогіі — следства расійскай і савецкай каланізацыі — старадаўнія казахі былі здаровыя, і ў тым ліку мелі моцныя зубы. Цікавая палеміка закончылася тым, што бакі прызналі: адсутнасць зубоў у казахскіх жанчын — ганьба для дзяржавы, якая зарабляе мільярды на нафце і газе.

**Па матэрыялах казахскіх сайтаў**

### КІТАЙ. ГАСТАРБАЙТЭРАМ СЕКС НЕ ДАЗВОЛЕНЫ

Кітайская прэса б'е трывогу. Наплыў у буйныя гарады з вёсак маладых мужчын-гастарбайтэраў пагражае інстытуту кітайскай сям'і і нават сацыяльнаму парадку. Сёння ў КНР прыкладна 145 мільёнаў унутраных гастарбайтэраў. Следствам феномену стала трагедыя 20 мільёнаў маладых жанчын, мужчыны якіх адправіліся за вялікім рублём у горад. Сваю другую палову яны бачаць, як правіла, раз на год падчас святкавання кітайскага Новага года. Адсюль дрэнны псіхічны стан жанчын, што ўплывае на стан іхняга арганізму і здароўе дзяцей. Другі акт трагедыі адбываецца ў гарадах. Маладыя мужчыны ў пошуках сексу ідуць у прытоны, звязаныя з арганізаванай злачыннасцю. Яшчэ адзін выхад для іх — завесці каханку, што фактычна разбурае сямейнае жыццё. Спецыялісты параўноўваюць працэсы ў КНР з сітуацыяй у паўночных штатах ЗША ў 1950-я гады, куды прыехалі на заробкі мільёны чарнаскурых гастарбайтэраў з поўдня. У пошуках сексуальнага задавальнення яны знішчылі сямейную мараль мясцовых жыхароў, далі штуршок стварэнню падпольнага бізнесу сексуальных паслуг, што спрыяла трансфармацыі чорных кварталаў у крымінальнае гета. На гэтым этапе барацьбы з сексуальнымі інстынктамі гастарбайтэраў улады Кітаю вырашылі абмежавацца абавязковым пунктам у статуце прадпрыемства, які патрабуе ад супрацоўнікаў ужываць прэзерватывы. Аднак некаторыя фірмы ўжо абавязалі персанал увогуле адмовіцца ад сексу па-за межамі сям'і.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### УКРАІНА. ЦІМАШЭНКА НЕ МОЖА НАСІЦЬ БЛАКІТНАЕ І ЖОЎТАЕ



24 жніўня Украіна адсвяткавала гадавіну незалежнасці. Часткай неафіцыйнай праграмы быў мітынг апазіцыі ў парку імя Тараса Шаўчэнкі. Яе арганізатары — партыя *«Батьківщина»* (старшыня Юля Цімашэнка) трактавала акцыю як сімвалічны пачатак адраджэння аранжавых. Падчас свайго выступу Юлія абвясціла кампанію *«Два кольори»*, прапанаваўшы ўсім працаўнікам Партыі рэгіёнаў насіць жоўта-блакітныя стужкі. Ужо на наступны дзень блізкая да партыі Януковіча прэса патрабавала забараніць *«Два кольори»*, паколькі асобная палітычная сіла не мае права манапалізаваць нацыянальныя колеры ў час сваіх акцый. Апазіцыянеры ў сваю чаргу кажуць, што забарона — гэта нонсенс. Гэта тое ж самае, што забараніць насіць сінія джынсы і жоўтыя майкі. Чым закончыцца дзіўная спрэчка наконт ужывання дзяржаўных фарбаў, стане вядома ў верасні, калі Юлія Цімашэнка і яе прыхільнікі паспрабуюць надаць кампаніі нацыянальны характар.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

---

ДАТА

# НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЗ ЖАРТАЎ НЕ БЫВАЕ

**Алег НОВІКАЎ**

**Напярэдадні святкавання 19-й гадавіны незалежнасці Украіны журналісты склалі хіт-парад самых смешных падзей часоў дзяржаўнага суверэнітэту. Вось некаторыя з кур'ёзаў сучаснай украінскай гісторыі.**

***

У 1990 годзе парад суверэнітэтаў ахапіў не толькі рэспублікі СССР, аднак і вобласці. Гэта, акрамя ўсяго, выражалася ў пераходзе на свой мясцовы час. Напрыклад, Закарпацкая вобласць вырашыла жыць па цэнтральнаеўрапейскаму часу (мінус адна гадзіна ад кіеўскага часу). У той жа час улады Крыму прапанавалі жыхарам паўвостраву жыць па маскоўскаму часу (плюс адна гадзіна да кіеўскага часу). Так краіна нечакана апынулася ў трох часавых паясах. Больш таго, у некаторых вёсках той жа Закарпацкай вобласці ўзнікла і была рэалізаваная на практыцы ідэя ўстанавіць свой асобны ад усіх час, які, як правіла, на 15–30 хвілін адрозніваўся ад кіеўскага.

***

У 1992 годзе ў Кіеве прайшоў Сусветны форум украінцаў. Падчас яго прадстаўнікі заходняй дыяспары рэзка крытыкавалі прэзідэнта Краўчука за знаходжанне былых сяброў КПСС ва ўладзе. У выніку гарант папярэдзіў грамадзян замежных дзяржаў пра недапушчальнасць крытыкі на адрас украінскага прэзідэнта, а таксама прыгразіў выслаць крытыкаў у краіны іх пражывання. У якасці рэакцыі «Маладая газета» надрукавала купон наступнага зместу: «Я (прозвішча, імя, імя па бацьку), разглядаючы сябе патэнцыйным прадстаўніком (указаць краіну) дыяспары, заяўляю, што я думаю пра Леаніда Краўчука наступнае (расшыфраваць). У сувязі з чым прашу выслаць мяне ў краіну маёй мары». У рэдакцыю прыйшло каля ста лістоў з лаянкамі на адрас Краўчука і просьбай выслаць іх у Злучаныя Штаты або Канаду.

***

23 жніўня 1993 года Севастопальская гарадская рада прыняла рашэнне «Пра расійскі федэральны статус горада Севастопаля». І ў той жа дзень яна прагаласавала яшчэ за адно рашэнне, адпаведна якому Дзень незалежнасці Украіны з'яўляецца выходным днём на тэрыторыі горада.

***

У 1994 годзе Мэр Палтавы Анатоль Кукоба ўручыў кампазітару Ігару Крутому і спявачцы Ірыне Алегравай, якія гастралявалі ў горадзе, памятныя знакі «За вызваленне Палтавы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Іншых медалёў у гарадскіх уладаў папросту не было.

***

У маі 1995 года старшынёй Вярхоўнай Рады АР Крым стаў камуніст Леанід Грач. Падчас выбараў Леанід Іванавіч спрабаваў усякім чынам эксплуатаваць сваё «птушынае» прозвішча. Ён выпусціў улётку пад загалоўкам: «*Грач — птица российская*». На адным баку ўлёткі былі намаляваны добрыя дамы і працуючыя заводы як знак Расіі, на іншым — разбураная глінабітная хата пад саламяным дахам як знак Украіны. Над ёй ляцела птушка грак, якая трымала ў дзюбе расійскі рубель.

***

У разгар прэзідэнцкіх выбараў 1999 года ў Данецку міліцыянты затрымалі Сяргея Салову, даверанную асобу кандыдата ў прэзідэнты сацыяліста Аляксандра Мароза. Яму інкрымінавалі распаўсюд улётак у выглядзе спецвыпуску друкаванага органа Вярхоўнай Рады газеты «Голас Украіны». У спецвыпуску паведамлялася пра тое, што Вярхоўная Рада вымушана звярнуцца да народа Украіны з афіцыйнай заявай. У заяве гаварылася, што Леанід Кучма памёр ад алкагольнага атручэння, а краінай кіруе яго двайнік. Салова за сваё «злачынства» атрымаў пяць гадоў з адтэрміноўкай выканання прысуду.

***

Канфуз адбыўся з прэзідэнтам Леанідам Кучмам падчас сустрэчы з Папам Рымскім Янам Паўлам II, які наведаў Украіну ў чэрвені 2001 года. Леанід Данілавіч сустракаў пантыфіка ў аэрапорце. Калі Кучме прыйшоў час зачытаць прывітанне, ён выдаў наступны перл: «Мы здолеем навучыцца кахаць свайго блізкага такім каханнем, якое, па словах апостала Паўлава...»

**У 2008 годзе дэпутат ад Блоку Юліі Цімашэнка Алег Анціпаў прапанаваў памяняць месцамі каляровыя палосы на дзяржаўным сцягу Украіны**

***

На парламенцкіх выбарах у сакавіку 2002 года ўсю Украіну весяліла кандыдат Алена Солад з Запарожжа. Алена — хатняя гаспадыня і маці дваіх дзяцей — памяняла сваё звычайнае прозвішча на Асама Бен Ладэн. У дадатак на публічных дэбатах на мясцовым тэлебачанні кандыдатка з'явілася ў адной накідцы і трусах яркага колеру. Так ці інакш, у дзень выбараў за Алену Асама Бен Ладэн было аддадзена 759 галасоў.

***

Падчас ліпеньскай паездкі 2003 года тагачаснага прэм'ера Віктара Януковіча па раёнах Чаркаскай вобласці мясцовымі чыноўнікамі актыўна выкарыстоўвалася практыка «пацёмкінскіх вёсак». Самыя камічныя эпізоды назіраліся ў харчовых крамах — падчас наведвання Януковіча з вітрын здымалася кіеўскае піва «Оболонь» і ставілася данецкае піва «Сармат».

***

У 2008 годзе дэпутат ад Блоку Юліі Цімашэнка Алег Анціпаў прапанаваў памяняць месцамі каляровыя палосы на дзяржаўным сцягу Украіны. Як было сказана ў тлумачальнай запісцы да законапраекта, цяперашняе іх становішча паводле кітайскіх народных вучэнняў азначае сталы заняпад, няшчасце. Калі ж зрабіць верх жоўтым, а ніз сінім, гэта спалучэнне колераў будзе тлумачыцца як гарманічны саюз Неба і Зямлі, мужчынскага і жаночага пачаткаў, як «шчасце». Дарэчы, законапраект адправілі на дапрацоўку.

***

У лістападзе 2008 года да дырэктара «Харкаўскага машынабудаўнічага заводу «ФЭД» Аляксандра Жданава прыйшлі прадстаўнікі Службы бяспекі Украіны (СБУ) і прапанавалі змяніць назву прадпрыемства, названага ў гонар першага чэкіста. У якасці альтэрнатывы агенты СБУ прапанавалі заводу ўзяць нейтральную палітычную назву «Рамонак». Пасля Жданаў распавядаў журналістам: «Я пераконваў, што не магу назваць завод «Рамонкам», бо прадукцыя заводу «лётае» ў 60 краінах, і растлумачыць усім, што «Рамонак» — гэта «ФЭД». Вынікам палемікі стаў кампраміс, адпаведная якому ФЭД цяпер будзе расшыфроўвацца не як Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі, а як «Фотаапараты Эцюды Дыяпраектары». Такі варыянт СБУ спадабаўся.

***

Зімой 2009 года ў Вярхоўную Раду паступіў законапраект «Пра прынянцце папраўкі да міжнароднай Дамовы пра захаванне кажаноў у Еўропе». Замест таго, каб хутка і моўчкі падтрымаць кажаноў націскам кнопкі «за», народныя дэпутаты пачалі ёрнічаць і ў выніку скаціліся да ўзаемных абвінавачванняў і банальнай спрэчкі. Як следства — праект быў правалены. Патрэбная колькасць галасоў у абарону кажаноў знайшлася толькі праз месяц.

КАМЕНТАР

# Стывен Гаўж: НАС ПАДТРЫМАЛІ ТОЛЬКІ ГАРЫ ПОТЭР І БРЫДЖЫТ ДЖОНС

**Споўнілася сто дзён дзейнасці ў Вялікабрытаніі кааліцыйнага кабінету кансерватараў і ліберал-дэмакратаў. Пра першыя вынікі працы ўраду, незвычайную гісторыю вяртання лібералаў да ўлады і іншыя аспекты брытанскай палітыкі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе са Стывенам Гаўжам, адным з кіраўнікоў Ліберальна-дэмакратычнай партыі.**



***— Апошні раз лібералы ўваходзілі ў склад кабінету ў далёкім 1945 годзе. Як увогуле атрымалася захаваць партыю, застацца на палітычнай сцэне?***

— Сапраўды, некалькі разоў пасля вайны нашай партыі прагназавалі хуткую палітычную смерць. Напрыклад, у 1960-я гады, калі ў парламенце было толькі шэсць дэпутатаў ад лібералаў. Або напрыканцы 1980-х, калі па выніках выбараў у Еўрапарламент нас абышлі Зялёныя. Тым не менш, мы не вымерлі і сёння, як бачыце, нават вярнуліся ва Уайтхол. Ліберальную партыю ва ўмовах засілля лейбарыстаў і кансерватараў выратавала камунальная палітыка. У 1960-я гады мы сфакусавалі нашу дзейнасць на вырашэнні лакальных праблем, кшталту пытання вывазу смецця, недасканаласці мясцовай інфраструктуры, дрэнай экалагічнай сітуацыі. Буйныя партыі на той час фактычна не цікавіліся такімі дробязямі. У выніку мы здолелі шмат дзе ўвайсці ў мясцовую адміністрацыю, што стала плацдармам для хуткіх паспяховых парламенцкіх кампаній.

***— Нават не чытаючы выбарчы маніфест лібералаў, усе ведаюць, што ваша галоўная задача — рэформа брытанскай электаральнай сістэмы. Чаму вам не падабаецца існуючая ў краіне мажарытарная сістэма?***

— Такая рэформа, на нашу думку, спрыяла б развіццю дэмакратыі. Без яе немагчыма паставіць на службу людзям палітычную сістэму, якая на сённяшні дзень згубіла празрыстасць, стала коснай і карумпаванай. Не выпадкова шмат сімпатый да нашага праекту электаральнай рэформы выклікаў буйны карупцыйны скандал з удзелам спікера парламента, які меў месца напярэдадні выбараў. Цяперашняя сістэма несправядлівая. Так, па статыстыцы, за нас галасуюць каля 20 працэнтаў выбаршчыкаў, а ў парламенце мы маем добра калі дзесятую частку мандатаў. У выпадку рэформы брытанскі парламент выглядаў бы прыкладна так: па 30–40 працэнтаў мелі б лейбарысты і торы, а 25 — лібералы. Мы вельмі цешымся з таго факту, што кансерватары пагадзілі з нашым патрабаваннем правесці рэферэндум наконт папраўак у выбарчы кодэкс.

***— Калі размова зайшла пра электаральную рэформу, цікава згадаць, што торы — вашы цяперашнія партнёры ва ўрадзе — у час выбарчай кампаніі ўпарта былі супраць любых пераменаў у гэтай галіне. Між тым, лейбарысты як мінімум пагаджаліся разглядзець вашы прапановы. Аднак калі пасля выбараў узнікла пытанне, да каго ісці ў кааліцыю, вы вырашылі «сябраваць» з кансерватарамі.***

— Гэта было няпроста. Не толькі з прычыны пытання рэформы выбараў. Як ўжо казаў, нашым каньком доўгі час была муніцыпальная палітыка. Законы Тэтчэр супраць мясцовага самакіравання ў 1980-я гады стварылі ў партыі моцную фракцыю заўзятых праціўнікаў торы. Тым не менш, мы абралі Дэвіда Кэмерана. Тут шэраг прычын. Першая — той факт, што лейбарысты шмат каму надакучылі, а лібералы ў вачах выбаршчыкаў былі партыяй пераменаў. Асобны фактар — фігура Гордана Браўна, з якім персанальна вельмі цяжка дамаўляцца. У той жа час Нік Клег і Дэвід Кэмеран па шматлікіх параметрах вельмі блізкія. Яны аднаго ўзросту, у іх аднолькавае сацыяльная паходжанне, падобныя кар'ерныя шляхі, яны нават абодва вучыліся ў Кембрыджы. Таму саюз з кансерватарамі выглядаў больш лагічна. Гэта праілюстравалі рашэнні партыйнай канферэнцыі, якая адбылася напярэдадні падпісання кааліцыйнай дамовы. 90 працэнтаў дэлегатаў ухвалілі фармат кааліцыі — торы плюс ліберал-дэмакраты.

***— Як вядома, сёння лейбарысты абіраюць новае партыйнае кіраўніцтва. Каго б хацелі бачыць лібералы на пасадзе старшыні?***

— Гэта цікавае пытанне. Нам бліжэй асоба Эда Мілібанда, былога міністра замежных спраў. Ён — сучасны палітык, прадстаўнік школы Тоні Блэра, які разумее, што левы рух павінен рабіць стаўку на моладзь і сярэдні клас прагрэсіўных поглядаў. У выпадку яго перамогі, нам было б вельмі лёгка знайсці з лейбарыстамі агульную мову і, што важна, пашырыць поле для манеўру. Варта таксама нагадаць, што гістарычна наша партыя з'яўляецца альянсам паміж старой партыяй лібералаў і сацыял-дэмакратамі — групоўкай, якая сышла ад лейбарыстаў на пачатку 1980-х. З іншага боку, як сведчаць сацыялагічныя апытанні, цяперашні рост папулярнасці лібералаў адбываецца менавіта за кошт былога электарату лейбарыстаў. Калі лейбарысты атрымаюць свайго Ніка Клега, леваму выбаршчыку будзе больш цяжка ідэнтыфікаваць нас як альтэрнатыву.

***— Прайшло сто дзён дзейнасці кааліцыйнага ураду. Вы задаволеныя вынікамі яго працы?***

— Хутчэй так, чым не. Акрамя праекту рэформы выбарчай сістэмы, пра які ўжо ішла размова, урад прыпыніў рэалізацыю закона аб увядзенні ідэнтыфікацыйных картак для грамадзян. На наш погляд, практыка праверкі дакументаў — гэта праява паліцэйскай дзяржавы. Мы пачалі рэформу сацыяльных служба́ў. Скарочаны раздутыя бюджэты міністэрстваў. Нік Клег давёў, што вайна супраць Іраку не мае легітымнай базы. Увогуле, для нас, ліберал-дэмакратаў, вельмі важна, што кансерватыўныя партнёры паступова ўспрымаюць нашы погляды. Сам кабінет мае, безумоўна, больш ліберальны, чым кансерватыўны профіль.

***— Брытанская дэмакратыя — самая старая ў свеце, і, як следства, грамадства, у тым ліку багема, вельмі палітызаваныя. Усе ведаюць, што Майкл Кейн або Крыс Ры, напрыклад, агітуюць за кансерватараў. Ці падтрымліваюць лібералаў якія-небудзь славутыя брытанскія артысты і публічныя асобы?***

— У час кампаніі нас публічна падтрымалі толькі Гары Потэр і Брыджыт Джонс (смяецца). (Маюцца на ўвазе акцёр Дэвід Дэніэл Рэдкліфа, які іграе Гары Потэра, і пісьменніца Хелен Філдзінг, якая прыдумала персанаж Брыджыт Джонс).

***— Ці лічыце вы, што зараз Вялікабрытанія перажывае важны этап. Ці зоймуць імёны Дэвіда Кэмерана і Ніка Клега вялікае месца ў падручніках гісторыі?***

— Магчыма. Калі мы здолеем рэфармаваць публічны сектар, пазбавіўшы яго нейкіх рудыментаў мінулага. Зрабіць службы больш дынамічным, інавацыйным, крэатыўным. Прымусіць іх адміністратараў адмовіцца ад пачуцця таго, што ўрад — гэта вечны патрон і спонсар. У такім выпадку кабінет Кэмерана — Клега сапраўды можна будзе параўнаць з самымі славутымі ўрадамі мінулага.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### КЕМАЛЬ КЫЛЫДЖДАРОГЛУ

Старшыня вядучай турэцкай апазіцыйнай Народнай рэспубліканскай партыі (СНК) зрабіў сенсацыйнаю для лідэра партыі, якая стаяла ў вытокаў Турэцкай рэспублікі і была заснаваная самім Атацюркам, заяву. Ён паабяцаў у выпадку вяртання яго партыі да ўлады дазволіць жанчынам насіць мусульманскія хусткі. На працягу амаль стагоддзя народныя рэспубліканцы ўспрымалі гэты элемент вопраткі як пагрозу рэспубліканскаму ладу. Аднак яшчэ больш незвычайна прагучала ідэя Кемаля пра амністыю для ўсіх вязняў — сяброў Курдскай рабочай партыі (РКК), якая з пачатку 1980-х гадоў вядзе барацьбу супраць Анкары пад лозунгамі стварэння незалежнай дзяржавы курдаў. Раней СНК стаяла на пазіцыях таго, што курдскага пытання ў Турцыі няма, і нават крытыкавала кіруючую зараз у краіне кансерватыўную Партыю справядлівасці і развіцця (АКР) за спробы весці перамовы з паўстанцамі. Рэвізію былых праграмных задач лідэр СНК тлумачыць патрэбай развіваць у краіне грамадзянскія свабоды. Курдскія колы, між тым, ужо падтрымалі прапанову Кемаля наконт агульнай амністыі для баявікоў РКК.

### ДЗМІТРЫЙ РАГОЗІН




Рагозін — вядомы расійскі палітык, былы лідэр сацыял-патрыятычнай партыі «Радзіма», якая ў 2003 годзе зрабіла сенсацыйны прарыў у Дзяржаўную думу, набраўшы 9 працэнтаў галасоў. У партыі было 135 тысяч сяброў. Больш толькі ў «Адзінай Расіі». У думе «Радзіма» праявіла сябе як партыя апартуністаў. Давер да яе хутка ўпаў. Сам Рагозін, як толькі праект «Радзіма» пачаў трашчаць па швах, атрымаў цёплае месца ў Бруселі як кіраўнік дэлегацыі РФ пры NATO. Між тым, зараз апошнія рэшткі «Радзімы» нечакана пачалі праяўляць знакі жыцця. З ініцыятывы вядомага эканаміста Міхаіла Дзелягіна 11 верасня павінна адбыцца агульнарасійская канферэнцыя. Мэта сходу — пачаць працэс рэгістрацыі новай старой партыі. Стаўка — вялікая. Спадзяванні, што партыя «Справядлівая Расія», якой Крэмль адвёў ролю левай апазіцыі, зможа ў перспектыве выцесніць з палітычнага поля КПРФ, не спрацаваў. Патрэбны новыя «левыя», функцыю якіх магла выканаць «Радзіма». Аднак, на думку экспертаў, Дзелягін не падыходзіць на ролю іх правадыра. Патрэбна вяртанне харызматычнага Рагозіна. Такі сцэнар Дзелягіну, натуральна, не падабаецца. Усе чакаюць, ці паспрабуе Рагозін адабраць «Радзіму» 11 верасня. Ходзяць чуткі, што ён ужо актыўна падкупляе мясцовыя секцыі напярэдадні сходу. У выпадку правалу мяцяжу Рагозін можа паспрабаваць таксама першым падаць у Мінюст заяўку наконт рэгістрацыі партыі пад назвай «Радзіма».

### ЦІЛА САРАЦЫН

63-гадовы былы міністр ураду Берліну ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (SPD) даўно даставаў кіраўніцтва партыі — і нарэшце дастаў. На працягу апошняга года ён стаў аўтарам серыі заяў расісцкага характару. Спачатку абвясціў турэцкіх і арабскіх эмігрантаў «машынамі па вытворчасці дзяўчат, якія носяць паранджу». Пасля заявіў, што школьнікі-немцы маюць асаблівы ген, які дазваляе ім быць больш разумнымі за прадстаўнікоў паўднёвых нацый. Супольнасць рэзка рэагавала на такія сентэнцыі. Так, Саюз габрэяў ФРГ прапанаваў Ціла перайсці ў шэрагі адной з неанацысцкіх партый. Выхадкі экс-міністра таксама кідалі цень на саміх эсдэкаў, якіх сталі ўсё часцей называць «антыэмігранцкай партыяй ». Шмат хто з актывістаў SPD, нашчадкаў эмігрантаў, на знак пратэсту супраць дэмаршаў Ціла паклаў партыйны білет на стол. І вось нарэшце трыванне Габрыеля Зіммера (цяперашні лідэр SPD) лопнула. Вырашана пачаць працэс выключэння Сарацына з шэрагаў партыі. Праўда, зрабіць гэта будзе вельмі цяжка. Раней мясцовая суполка, сябрам якой з'яўляецца Сарацын, не дала згоды на ягонае выключэнне. Цікава, што эсдекі традыцыйна маюць праблемы са старымі сябрамі партыі. Так, Вольфганг Клемент, экс-міністр эканомікі ў кабінеце Шродэра, перабег у 70-гадовым узросце ў лагер лібералаў. Ота Шылі (77 год) — былы міністр юстыцыі — падтрымлівае ідэю хрысціянскіх дэмакратаў працягнуць тэрмін эксплуатацыі нямецкіх АЭС.



▸ ПОСТАЦІ

# Зміцер Колас: «БЕЛАРУСКАЯ МОВА — ДЛЯ ДОБРЫХ СПРАЎ»

**На пытанне, колькі ж выдадзена ім агулам кніг, перакладчык і выдавец Зміцер Колас дае адказ з цяжкасцю — каля дзвюх соцень. Прынамсі, за апошнія няпоўныя 5 гадоў дзейнасці ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка — 100. А раней быў выдавецкі аддзел Беларускага Гуманітарнага культурна-адукацыйнага цэнтра (ліцэя) і кароткі час супрацоўніцтва з выдавецтвам «Энцыклапедыкс». Пра тое, з чаго пачынаўся лёс перакладчыка і як выдаюцца беларускія кнігі, Аляксей Хадыка гутарыць са Зміцерам Коласам.**



— Я з дзяцінства любіў літары. Бацькі з замежных падарожжаў прывозілі разнастайныя выданні, якія я з задавальненнем разглядаў. Брат Уладзімір, старэйшы за мяне на 6 гадоў, пайшоў у школу і вучыў мяне літарам, гэтаксама як і дзед з бабуляй. Так і склалася, што ў 3 гады я ведаў ужо два алфавіты — лацінскі і кірылічны. Размаўлялі ў хаце і па-беларуску, і па-руску. Калі ішла сур'ёзная размова — заўсёды па-руску. А пад добры настрой ці ў свята — пераходзілі на беларускую. Таму ў мяне стваралася ўражанне, што беларуская мова — вясёлая і прызначаная для добрых спраў. Зрэшты, мовы тады асабліва ў галаве не падзяляліся.

***— Калі ж прыйшло разуменне, якую прафесію абраць?***

— Тады, калі зразумеў, што не стану пісьменнікам. Я чытаў, колькі можа прачытаць дзіцё. І калі прачытаў дастаткова, зразумеў, што наўрад ці я напішу нешта новае. Большасць новых пісьменнікаў пішуць тое ж, што і ранейшыя, толькі па-свойму. І літаратура зводзіцца найперш да стылістыкі. А выяўляць сябе ў стылістыцы можна з дапамогай перакладаў. Усвядоміў я гэта пазней, але ў інстытут паступаў ужо з дакладнай мэтай стаць перакладчыкам.

Пераклад — гэта творчасць, абумоўленая матэрыялам, які ўтрымлівае арыгінал. Ты звязаны сюжэтам, але абсалютна вольны ў лексічным плане: кожная мова будуецца па-свойму лексічна, стылістычна і сінтаксічна. Можна сказаць, што мова зрабіла з малпы чалавека. І адрозніваемся мы менавіта мовамі. Мова ўплывае нават на знешні выгляд чалавека: у кожнай мове свае інтанацыі і нават дыханне, прамоўца па-рознаму варушыць языком. Адпаведна, і твар пачынае фармавацца па-іншаму.

***— Вы гаворыце пра асаблівасці стылю, а ці магчымыя вольнасці з сюжэтам?***

— Усе сюжэты створаныя ў Старажытнай Грэцыі, і новы не выдумае і арыгінальны пісьменнік. Ён можа ўзяць фактalogію, а перакладчык звязаны больш, чым пісьменнік, бо ён абмежаваны сюжэтнымі лініямі і паваротамі, якія створаны арыгінальным пісьменнікам. Але ён вольны ў выбары лексічных сродкаў у сваёй мове. Прыкладам, можна сказаць «мне знаёма» ці «я ведаю», і выбар тут часцей на густ перакладчыка. Хоць бывае, што і такія рысы ўваходзяць у адметнасць арыгінальнага твора. У апавяданні Сартра «Мур» ідзе аповед ад асобы галоўнага героя, але ён сам ад сябе адасоблены. Калісьці я пераклаў адзін з эпізодаў прыкладна так: «Нас заштурхнулі ў вялікі светлы пакой, і я адразу заміргаў ад яркага святла, якое ўдарыла ў вочы». З цягам часу я зразумеў памылку, бо трэба было напісаць «мае вочы заміргалі», падкрэсліваючы адасобленасць унутранага стану героя. У прынцыпе, пераклад робіцца не слова словам, сказ сказам, і нават не раздзел раздзелам, а вобраз вобразам. Вобразы складаюцца на працягу ўсяго твору, і калі гэта адчуць, пераклад атрымліваецца.

***— Выдатнае веданне моваў даў Мінскі інстытут замежных моў?***

— Я зразумеў, што апроч гэтага інстытута вывучыць на патрэбным узроўні замежную мову я не змагу. Ездзіць за мяжу было немагчыма, а ў іншых інстытутах мову «вучылі», а не вывучалі. На філалагічным факультэце БДУ выкладалася літаратура, а не мова. А літаратуры мяне ўжо навучыў бацька… Мне з дзяцінства было страшна глядзець на хатнія кніжныя шафы, якія пагражалі абрынуцца на мяне. А бацька ўсё гэта прачытаў, і быў для мяне сапраўднай «акадэміяй», бо мог расказваць пра любога аўтара і твор, падкрэсліваючы яшчэ дэталі і адмысловасці.

Мне папросту пашанцавала, бо Інстытут замежных моў быў наймацнейшай ВНУ ў сваёй галіне ў СССР. А на чацвёртым курсе на палову года я ездзіў на стажыроўку ў Францыю. Стажыроўка была неверагоднай удачай. Калі мы прыехалі ў Францыю, нам сказалі — вы размаўляеце на выдатнай мове герояў Бальзака… А пасля я зразумеў, каб навучыцца мове, трэба пачынаць, як пачынае дзіця. Я ператварыўся ў французскае дзіця, хуценька прачытаўшы казкі, дзіцячую і падлеткавую літаратуру.

***— Прачытаўшы, пачалі выдаваць кнігі...***

— Выдадзена шмат цікавых кніг, але ацэньваць маюць права найперш чытачы. Пачынаў я з дзіцячай і юнацкай літаратуры, хаця і зараз ёсць пераемнасць: гэта і Карлсан, і Піпі Доўгаяпанчоха, і Мумітролі (першы выпуск — «Маленькая тролі і вялікая паводка», сёлета запланаваны яшчэ два). Ёсць думкі перавыдаць Шарля Перо. Але на сёння дамінуюць серыі «агульнага попыту» — «Літаратурная скарбонка» ў мяккай вокладцы і «Littera scripta» — у цвёрдай, падобная да савецкіх «*Классиков и современников*». Апошняя пачалася летась з Патрыка Бесона і «Фердыдуркі» Вітальда Гамбровіча. Неўзабаве з'явяцца «Мажлівасць выспы» Уэльбека, «Евангелле ад Пілата» Шмідта ў перакладзе Андрэя Хадановіча. У іншай серыі «Бібліятэка французскай драматургіі» выйшла тры выпускі (кожны ўтрымлівае па 3 п'есы), рыхтуецца чацвёрты. Я даўно супрацоўнічаю з Васілём Сёмухам, якога лічу настаўнікам-«патронам» у перакладчыцкай дзейнасці. Зараз ім падрыхтавана некалькі тэкстаў, да выдання якіх рэалічваю падступіцца, сярод іх «Стэпавы воўк» Германа Гесэ. Па парадзе нямецкага калегі днямі выйшаў на знакамітага новазеландскага пісьменніка — імя пакуль сакрэт. Бабуля новазеландца нарадзілася ў Мінску.

Зараз сярод перакладчыкаў ідзе «розрух», з'яўляецца нямала новых імёнаў. Адзінае, што трэба знаёміцца з тэкстамі ў сэнсе іх чытэльнасці і «рэдагібельнасці». Прапаноўваецца не перакладаная раней класіка, як «Лялька» Пруса, творы Бернарда Шоу — што ўваходзіць у мае выдавецкія планы бліжэйшага года для серыі «ўсяго напісанага», «Littera scripta». Мяркую працягнуць выданне асноў перакладчыцкай дзейнасці — слоўнікаў. Хутка з'явіцца самы ёмісты з тэхнічна падрыхтаваных мной слоўнікаў — беларуска-нямецкі на 70 тысяч словаў і словазлучэнняў (спажыўцы ўжо атрымалі англійска-беларускі і нямецка-беларускі). Адна з маіх мараў — стварэнне французска-беларускага слоўніка, але стрымлівае адсутнасць часу: даводзіцца займацца і перакладамі, і выданнем, і рэалізацыяй надрукаванага. І мала сказаць, што гэта цяжка, бо, улічваючы заказныя выданні, я выпускаю каля 25 кніг на год, не адмаўляючы ў супрацы літаратарам-пачаткоўцам. Апошняе — прынцып, паколькі сапраўдная літаратура мусіць расці «на грунце». Чым болей выдаецца, тым болей шансаў, што мы ўбачым новы сапраўдны талент.

Часам аб'ёмныя кнігі займаюць месяцы працы, як зборнік, што з'явіцца днямі, — «Успаміны і дзённікі» беларускай эмігранткі з ЗША Зоры Кіпель, кніга, я б сказаў, не аднаго жыцця, на 992 старонкі.

***— А якія са сваіх праектаў Вы лічыце найбольш удалымі?***

— Ва ўласным успрыняцці я найперш перакладчык, а не выдавец. З таго, што давялося перакласці, мне падабаецца «Праект рэвалюцыі ў Нью-Ёрку» Алена Роб-Грые, пераклады Шарля Перо, урыўкі з Рабле і «Песні пра Раланда». Дзве апошнія працы я спадзяюся дарабіць цалкам, бо ўрыўкі друкаваліся толькі ў двухтомнай «Хрэстаматыі літаратуры народаў свету», амбітным выданні часоў БГКАЦ, складанням якога кіраваў Лявон Баршчэўскі. Супрацоўніцтва з апошнім цягам маёй выдавецкай працы вельмі плённае. Працягну пераклады Жана-Поля Сартра і Альбера Камю, у прыватнасці рамана «Чума», не скончаныя ў 1980-я, калі творы гэтых аўтараў выходзілі ў «Мастацкай літаратуры». Што ж да п'ес Камю, я іх пераклаў і надрукаваў у розных зборніках усе.

***— Што з Вашых работ знаходзіла ўвасабленне на сцэне?***

— Нямала, прычым перакладаў не толькі з французскай, але і з англійскай. «Чароўная ндзелька для пікніка» Тэнесі Уільямса ставілася ў Маладзёжным тэатры, як і «Маленькая Аліса» Эдварда Олбі. Апошняя, вельмі цікавая, але закручаная, з тэатру абсурду, пратрымалася нядоўга: яна разлічана на спецыфічнага, вельмі падрыхтаванага гледача. Мікалай Пінігін папулярную п'есу Франсіса Вебера «Вячэра з дурнем» ставіў двойчы — па-руску ў антрэпрызе і па-беларуску ў Купалаўскім. Да тэатра ў мяне асаблівае стаўленне, бо я быў выхаваны бацькам — тэатральным крытыкам, шмат п'ес і глядзеў, і чытаў. Зараз ідзе падрыхтоўка пастаноўкі — не будзем пакуль раскрываць таямніцы, дзе і калі, — з Шарля Перо, такога спектакля, які б зацікавіў і дзяцей, і дарослых. Бо вядома, усе казкі Перо заканчваюцца абсалютна дарослымі маралямі…

***— Як выдавец, раскажыце пра стан рэалізацыі беларускамоўнай літаратуры.***

— Гэта боль усіх выдаўцоў, і прыватных, і дзяржаўных, хаця дзяржаўным лягчэй. Яны маюць магчымасць распаўсюду кніг праз бібліятэкі і адміністрацыйным рэсурсам. Кнігарні плацяць нерэгулярна, што азначае немагчымасць аднаўлення роўнага па памеры выдавецкага цыклу пры спозненым вяртанні сродкаў. На пачатку 1990-х гадоў беларуская і дзіцячая літаратура не абкладалася падаткамі, зараз сітуацыя іншая. Уявіце, продаж кніг ліцэнзуецца пад пазіцыяй «гандаль канцтаварамі». Калі ў той жа Расіі кнігавыдавецтва не абкладаецца падаткамі, то захоп рынку расійскай кнігай тлумачыцца не толькі фактарам моўнай сітуацыі, але і тым, што пры больш спрыяльных падатковых умовах і аб'ектыўна вялікіх накладах расійская кніга атрымліваецца танней і больш якаснай. Без дзяржаўнай апекі над літаратурай не варта чакаць ніякага зруху. У Беларусі сітуацыя выключная: ва ўсім свеце выданне літаратуры не толькі ільгатуецца, але атрымлівае вялізныя субсідыі ад дзяржавы і ад грамадства. У нас жа адсутнасць грамадскіх фондаў па падтрымцы гуманітарных пачынанняў дапаўняецца падатковым прэсам.

Неабходна іншае стаўленне да беларускай мовы і культуры. Мова павінна вывучацца не як лаціна ў «рэзервацыі» ў школе. Выйшаўшы з яе сцен, мы не можам ні паглядзець кіно па-беларуску, ні прачытаць класіку. У нас яшчэ не перакладзеная сусветная класіка, а калі мы хочам мець вышэйшую беларускую школу, нам неабходныя адпаведны корпус тэкстаў. Адкрываючы беларускі універсітэт, пра што зараз нярэдка гаворыцца, трэба паралельна перакладаць літаратуру. Выкажу крамольную думку, гэта можна рабіць як калісьці ў краінах Балтыі, у якіх, па вызваленні ад Расійскай імперыі, пераклады класікі цягам дзесятка гадоў ажыццявілі не заўсёды з моў арыгіналаў, а ўвогуле з любых моў, разумеючы, што сілаў малых народаў на іншае не хопіць. Пераклад — інструмент дабудовы нацыянальнай культуры, таму ў свеце перакладаў выходзіць у сотні разоў больш за арыгіналы.

ПРАГНОЗ

# СОНЦА ЎДАРЫЦЬ ПА РЭЖЫМУ

Андрэй РАСІНСКІ

**Сонца спаліла зямлю. Расія захлынулася ад пажараў. Па тэлевізіі расказалі, як суседзі пакутуюць — і як хораша і стабільна ў сённяшняй Беларусі. Але… Сонца рыхтуе рэжыму знішчальны ўдар.**

## Рэха сонечных штормаў

У далёкім 1918 годзе гісторык Аляксандр Чыжэўскі абараніў дысертацыю. Высновы працы — скандальныя: гістарычныя падзеі падштурхоўваюцца сонечнай актыўнасцю. Актыўнае Сонца, з плямамі — гэта рэвалюцыі ў Англіі (1648), Францыі (1789 і 1830), вясна народаў 1848 года, паўстанне ў Італіі (1860), Парыжская камуна (1870), рэвалюцыі ў Расіі (1905 і 1917). Гэта вялікія перасяленні народаў, ганенні на яўрэяў, Варфаламееўская разня, псіхічныя эпідэміі.

Падчас сонечных пікаў вылучаюцца духоўныя і палітычныя лідэры: Аларых (395), Атыла (441), Мухамед (622), Тамерлан (1367), Жанна Д'Арк (1429), Саванарола (1489), Ілжэдзмітрый (1605), Багдан Хмяльніцкі, Алівер Кромвель (1648), Вашынгтон (1777).

Нават Напалеон, які, здавалася, толькі па ўласнай волі скараў Еўропу, падпарадкоўваўся сонечным цыклам. На сонечным піку 1804 года ён каранаваўся, а ў 1816 годзе (другі пік) — паспрабаваў вярнуцца да ўлады.

А вось паспяховыя ваенныя паходы, калі інтэрвенцыя амаль не сустракае супраціву, лепей ладзіць на сонечных мінімумах.

Чыжэўскі падсумаваў:

«1) У сярэдніх пунктах сонечнага цыклу масавая дзейнасць чалавецтва на ўсёй паверхні Зямлі, пры наяўнасці ў чалавечых супольнасцях эканамічных, палітычных ці ваенных узбуджальных фактараў, дасягае максімальнай напругі, што выяўляецца ў псіхаматорных пандэміях: рэвалюцыях, паўстаннях, войнах, паходах, перасяленнях <…>.

2) У крайніх пунктах цыклу напруга агульначалавечай дзейнасці ваеннага ці палітычнага характару паніжаецца да мінімальнай мяжы, саступаючы месца <…> дэпрэсіі мас…»

Надалей высветлілася, што выбухі Сонца ўплываюць на эпідэміі халеры і грыпу, на дыфтэрыйныя атакі (яны ўпадабалі мінімумы), на траўмы і няшчасныя выпадкі, на смерць ад інфаркту. Нават тое, як кроў выпадае камякамі, як навукоўцы робяць адкрыцці і як развіваюцца ва ўлонні алігафрэны, — працэсы, чулыя да сонечных выбухаў.

Далёкае рэха сонечных штормаў узмацняецца масамі. Высновы Чыжэўскага пацвердзіліся: 1957 год (1956 — Венгрыя), 1968 год (Пражская вясна), 1979 год (Іранская і Афганская рэвалюцыі — 1978), 1989 год — канец камунізму, 2001-ы — атака тэрарыстаў.

## Памяркоўныя з камянямі

Скептыкі могуць паціснуць плячыма: «А ў нас стабільнасць. І памяркоўныя беларусы, якія ад сонца аніякім чынам не залежаць». Але беларусы ў гэтым сэнсе нічым не розняцца ад іншых народаў. Паглядзім на «памяркоўных» уважлівей.




Вось іх дзейнасць за апошнія два стагоддзі:

1817–1823 — тайныя студэнцкія таварыствы ў Віленскім універсітэце (заснаванне супадае з сонечным максімумам за 1816–1817 гады).

1830–1831 — шляхецкае паўстанне ў Беларусі, Літве і Польшчы — гэта наступны сонечны пік 1830 года.

1836 — Франц Савіч стварае нелегальнае студэнцкае «Дэмакратычнае таварыства» (акурат на піку 1837 года).

1846–1849 — дзейнасць на Беларусі падпольнай арганізацыі «Саюз свабодных братоў» (чарговы пік 1848 года).

Сонечны максімум 1860 года суправаджаўся сялянскімі хваляваннямі ўлетку і стварэннем падпольных арганізацый, што рыхтавалі чарговае паўстанне. Само паўстанне 1863–1864 гадоў адбылося на спадзе сонечнай дзейнасці (што, магчыма, і паўплывала на яго сумныя вынікі). Аднак праз 20 гадоў беларусы ад душы кампенсавалі маўчанне абяскроўленых 70-ых.

У 1881 годзе ў Пецярбургскім універсітэце ствараецца нелегальнае беларускае зямляцтва; у краі з'яўляецца паўночна-заходняя арганізацыя «Народная воля». Ігнат Грынявіцкі забівае цара Аляксандра II. У 1884 годзе выдаецца нелегальны часопіс «Гоман», з'яўляюцца першыя рабочыя гурткі. У Вільні друкуецца «Праграма рабочых», у 12 валасцях Бабруйскага, Слуцкага і Ігуменскага паветаў адбываюцца хваляванні сялян. Гэта ўсё адбывалася на сонечным піку 1880-х гадоў.

Наступны сонечны выбух суправаджаўся страйкамі: 1894 год — забастоўка рабочых Гомельскіх чыгуначных майстэрняў. 1895 год — страйк мінскіх чыгуначнікаў. Усё — па максімуме 1893 года, калі ўзровень сонечнай актыўнасці быў яшчэ даволі высокім.

Сонечныя пікі былі і ў 1905 і 1917 гадах.

Найвышэйшы ўздым Беларускай сялянска-работніцкай грамады ды Таварыства Беларускай школы ў Заходняй Беларусі прыпадае на 1926–1927 гады. Гэта сонечны пад'ём 1928 года, але актыўнічаюць і карнікі. У Косаве расстрэльваюць працоўных. Над забароненай Грамадой вядуцца суды. Ва Усходняе Беларусі ўздымаецца хваля сталінскіх рэпрэсій супраць «нацыянал-дэмакратызму» і пачынаецца тэрор калектывізацыі.

Зрэшты, пад сонечным максімумам 1937 года лютуе таталітарны рэжым.

1946–1947 гады — у Навагрудку ствараецца Саюз вызвалення Беларусі, у Глыбоцкай і Пастаўскай вучэльнях — Саюз беларускіх патрыётаў. (Натуральна — усё на піку сонечнай дзейнасці.) У заходніх раёнах Беларусі ў 1946–1949 гадах дзейнічае падпольны «Саюз змагання за незалежнасць Беларусі».

У 1956 годзе за антысавецкую агітацыю асуджаецца малады журналіст Фёдар Кардаш. У Гомелі ў 1956–1957 гадах дзейнічае падпольная арганізацыя «Партыя свабоды рускага народа». Адпаведны сонечны максімум — 1957 год.

На пад'ёме сонечнай актыўнасці мастак Яўген Кулік арганізуе асветніцкую супольнасць «На Паддашку» (1966 год). Калі сонечныя плямы растуць — выбухае «другое слуцкае паўстанне». Шматтысячны натоўп патрабуе для камуніста, які забіў чалавека, смяротнага пакарання. Адбываецца крывавая сутычка з сіламі аховы. Памяшканне суда спалена, 70 чалавек асуджана.

Чэхаславацкія падзеі выклікаюць у Беларусі розгалас (і рэпрэсіі). Студэнты БДУ патрабуюць перавесці выкладанне на беларускую мову. У 1969 годзе (доўгі сонечны максімум) — 20 тысяч выбаршчыкаў галасуюць супраць кандыдатаў у мясцовыя саветы (гэта ў камуністычныя часы!). І пад завязку — пакуль сонца яшчэ гарачае — адбываецца бойка мінскіх хіпі з міліцыяй (з боку хіпі — да 400 чалавек).

Дык няўжо беларусы не адчувальныя да сонечных выбухаў?

Нарэшце, 1979 год. Арганізуецца Беларуская спеўна-драматычная майстроўня. Няцяжка здагадацца — на сонечным піку. А наступны сонечны выбух, які прынёс Беларусі волю, многія добра памятаюць.

Дарэчы, у Беларусі адзін сонечны пік слабейшы, другі — мацнейшы, аднак найбольшыя грамадскія забурэнні адбываюцца праз 22 гады.

**Дарэчы, у Беларусі адзін сонечны пік слабейшы, другі — мацнейшы, аднак найбольшыя грамадскія забурэнні адбываюцца праз 22 гады**



Вільям Блэйк. Чырвоны Дракон і Жонка, апранутая ў сонца (1806–1809)

## Канец непрыгожай эпохі

Аляксандр Лукашэнка прыйшоў да ўлады, калі сонца рэзка сціхылася — і людзі знясілелі. У гэтым кіраўнік Беларусі падобны на Брэжнева, які скінуў Хрушчова падчас сонечнага мінімуму 1964 года.

Зрэшты, рэферэндум 1996 года — гэта самы мінімум у сонечным цыкле. Аляксандр Чыжэўскі быццам пра Беларусь пісаў: «Перыяд мінімальнай узбуджальнасці спрыяе капітуляцыі, акупацыі, максімальнаму скарачэнню парламентарызму, узмацненню адзінаўладдзя».

Затое наступныя фазы для «адзінаўладдзя» неспрыяльныя. Падчас «росту ўзбуджальнасці» палітыкі і прэса аднаўляюць свой уплыў. Пытанні палітычныя ставяцца і абвастраюцца.

На этапе «максімальнай узбуджальнасці» (і сонечнай актыўнасці) «дастаткова невялікай нагоды, каб масы загарэліся». Чыжэўскі пераканаты, што «стыхійны гвалт, жорсткасць, азлабленне, эпілептычнае шаленства, прага помсты, эпідэмія забойстваў, панік, пагромаў, спусташальных набегаў» супадаюць з часам найвышэйшай сонечнай актыўнасці.

Спадзяюся, што Беларусь засцеражэцца ад эксцэсаў, тым болей, што плады трэцяй фазы — «максімальнае развіццё парламентарызму», «дэмакратычныя і сацыяльныя рэформы», «абмежаванне адзінаўладдзя». Але нават чацвёртая фаза — «падзення ўзбуджальнасці» для дыктатуры неспрыяльная. Памаранчавыя рэвалюцыі адбыліся на сыходзе сонечнай актыўнасці.

Рэжым праскочыў пік 2000 года, адкупіўшыся ад яго чужымі ахвярамі. Патэнцыйныя канкурэнты былі знішчаныя эскадронамі смерці. Яшчэ адно крывавае «дасягненне» — Няміга.

Адначасова мітынгі 2000-х збіралі нечуваныя на сённяшні натоўпы. А дзяржаўную прапаганду доўга калаціла ад дэманстрантаў з камянямі (наступствы сонечнай актыўнасці 1999 года). Але новыя лідэры на той час былі яшчэ кволымі.

Выглядае, што цяпер — інакш. Нават халодны 2006 год, калі сонца ледзьве ліпела, спарадзіў Плошчу. А 2008-ы — самая сонечная зіма (і страчаны час для ідэальнага наменклатурнага перавароту) — суправаджаўся нестандартнымі для сезону фразамі пра лібералізацыю. Толькі грамадскія праблемы засталіся неразвязанымі — і назапашваюцца, як ладная бочка пораху.

Тым часам колькасць сонечных плямаў пачала павышацца.

У 2010 годзе іх будзе яшчэ ня шмат — і гэта дазволіць рэжыму па інерцыі праскочыць «выбары». Затое пасля выбараў — цяжкі 2012 год. Чаканы сонечны максімум (які можа ссунуцца на 2011–2014 гады).

Выбухі на Сонцы абяцаюць стацца мацнейшымі, лідэраў у натоўпаў можа не быць, увогуле («без прэзідэнта!», «парламенцкая рэспубліка!»).

Сонечны шторм набліжаецца.

ВЫСТАВА

# ВЯРТАННЕ МАСТАКА

Аляксей ХАДЫКА

**Прайшло каля 10 гадоў ад таго часу, як сям'я мастакоў Наталлі Залознай і Ігара Цішына пасялілася ў Бельгіі. Беларускае культурнае прадстаўніцтва на Захадзе — так можна сказаць пра іх, бо яны не толькі па-ранейшаму дэкларуюць сваю сувязь і прыналежнасць да радзімы, але імкнуцца рэпрэзентаваць яе на буйных міжнародных форумах. На Венецыянскім Біенале–2005, не чакаючы прыходу ў Венецыю дзяржаўных музейных структур з Беларусі, яны разам з Валерыем Шкарубам, Русланам Вашкевічам, Уладзімерам Цэслерам, Леанідам Хобатавым і Андрэем Задорыным узялі ўдзел у арганізацыі першага беларускага павільёна.**

Зараз Залозная і Цішын вяртаюцца ў Беларусь з уласнымі маштабнымі выставамі. Увесну залы Музея сучаснага мастацтва прымалі творы Залознай, а 30 жніўня наведвальнікаў сустрэла серыя работ Ігара Цішына «Мэта». Сабралася нязвыкла багата публікі — крытыкі, літаратары і мастакі, сябры Ігара, якія атакавалі крыху разгубленага творцу: ён спрабаваў слаба супраціўляцца, прапануоўваючы дасылаць бясконцыя пытанні прэсы электроннай поштай у Бельгію. Цішына вітаў яго настаўнік па Беларускай акадэміі мастацтва Гаўрыіл Вашчанка, выказаўшы задавальненне, што за гады працы на Захадзе майстэрства яго вучня толькі вырасла.

Трансгрэсія — так ахрысцілі экспазіцыянеры жывапісныя якасці палотнаў Цішына ва ўступным слове, маючы на ўвазе дынамічны характар прасторы твораў, у якіх надпісы, бы ў іконе, накладаюцца на выявы, дадаючы магчымасці ўяўленню адпраўляцца ў шлях дарогай асацыяцый і неспазнаных сэнсаў. Жывапіснае вымярэнне ў іх раз-пораз суадносіцца з фатаграфічнымі выявамі (серыя «Пераўтварэнне», 2010). А ў палатне «Узлёт», якое спалучае шагалаўскую каларыстыку і абагульненне форм са стылістыкай беларускіх народных абразоў, да аблокаў імкнецца вазок на колах з напаўпрывіднай постаццю — чым ні старазапаветнае ўзнясенне прарока Іллі на неба? Побач — мэта ўзлётнага падарожжа, «ілюзія» раю, дзе мастак прапануе пагрэцца ля вогнішча з паленцаў дроваў, ля якога высыпаныя на палатно збылтаным хаосам літараў і словаў радкі ці то ўспамінаў, ці то вершаў.

Няскончаныя фразы, паўзагадкавыя вобразы — чаму ў героя палатна «Чырвоная барада» барада чырвоная? Чаму пасярод неакрэсленай умоўнай чорна-белай прасторы з штрыхамі-прывідамі постацяў і слоў узвышаецца будка транспартнага прыпынку з надпісам «Мэта»? Падобна як энергічная колерава-фактурная кампанента твораў падштурхоўвае эмацыйна-пачуццёвае ўспрыняцце кампазіцый, так загадкавасць выяваў накіроўвае фантазію па плыні асацыяцый. Работы свабодна, з павагай, прасторавымі паўзамі размешчаны ў памяшканні музея — глядзі, думай, адчувай. Майстар вяртае гледачу паўнавартасную станковую карціну, якая зусім не «памерла», а жыве ў напоўненай энергетыкай новай форме.

Выстаўленыя зараз у Мінску работы раней дэманстраваліся на персанальнай выставе «Крызіс у раі» ў галерэі Эспас Бланш у цэнтры Бруселя. Тады Цішын падкрэсліў уяўнасць пошукаў раю на зямлі і трывожнага дысанансу паміж прыгажосцю натуры і недасканаласцю чалавечага жыцця, якасцяў, што натхнялі яго — у чыіх бы вы думалі працах? — Піцера Брэйгеля. «Не пытайце мяне, дзе знаходзіцца рай, — у мяне няма простага адказу», — пракаментаваў тады ідэю серыі твораў мастак.

Ігар Цішын, Андрэй Задорын, які з'ехаў пасля рэферэндуму пра сцяг і мову ў Галандыю, ці Сяргей Рымашэўскі, які застаўся, — героі новага фільма Уладзіміра Коласа «Крызіс у раі», які хутка можна будзе ўбачыць на «Белсаце». Пакаленне, у творчасці якога так ці інакш адлюстраваўся канфлікт — праз эміграцыю ці дыстанцыяванне ад афіцыёзу ў андэграўнд. Дзякуючы маштабу талентаў Еўропа за нашымі заходнімі межамі кагосьці з іх прыняла фізічна, кагосьці — творамі, з захапленнем набытымі ў калекцыі і музеі. Зараз надыходзіць час іх звароту на радзіму і спробы новага дыялогу.



Ігар Цішын ля палатна «Узлёт»

«Урэшце, мне падабаецца факт майго вяртання ў Беларусь, галоўнае, што зараз ёсць такая магчымасць, ездзіць сюды і вяртацца ў Бельгію. Спадзяюся, што хутка ў мяне будзе шанс наведваць гістарычную радзіму часцей: падрос сын, ён амаль дарослы, і мы з Наталляй вальней перамяшчаемся па свеце. Час зараз не такі, як пры савецкай уладзе, калі ты з'ехаў — і не можаш вярнуцца. Так што я і Наталля плануем свае выставы ў Беларусі ў іншых залах досыць хутка, можа, у наступным годзе», — паведаміў «НЧ» мастак. І зазначыў, што, на яго думку, сярод тых, хто пакінуў Беларусь у 1990-я, хто расчараваны яе паваротам назад у савецкі застой, але не страціў ідэнтычнасці, будзе развівацца рух да аб'яднання. Мэта — супольныя культурныя праекты, дзе гэтая ідэнтычнасць магла б захавацца і выявіцца.

Персанальныя выставы мастака апошнімі гадамі праходзілі ў Мінску, Цюрыху, Бруселі, Лондане, Ітане, Гаазе, Кёльне і Малазе, разам з іншымі творцамі яго работы экспанаваліся ў Венецыі (біенале), Варшаве, Берліне, Эсене, Генце, Клермон-Феране, Маскве і Браціславе. Мінская выстава Ігара Цішына будзе працаваць да 11 верасня.

ФЕСТЫВАЛЬ

# ХРЫСЦІЯНСКАЕ КІНО Ў БЕЛАРУСІ

**Міжнародны фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм «Magnificat» — з'ява адметная як у кінематаграфічным, так і ў рэлігійным жыцці Беларусі. На гэты раз яго адкрыццё адбудзецца ў Мінску 7 верасня, дэманстрацыя ж асноўнай часткі конкурснай праграмы ўжо традыцыйна пройдзе на Глыбоччыне з 8 па 11 верасня. Пра асаблівасці сёлетняга кінафоруму з яго нязменны прэзідэнтам, рэжысёрам дакументальнага кіно Юрыем Гарулёвым размаўляў Алесь Лапо.**

***— Наколькі ў свеце распаўсюджана практыка злучаць кіно і рэлігію?***

— Самы магутны кінафестываль рэлігійнага кшталту — рымскі «Religion today», на якім прадстаўляюцца хрысціянскія, мусульманскія, будысцкія фільмы, кінапрадукцыя больш дробных рэлігій. Аднак нельга сказаць, што рэлігійны ці хрысціянскі кінематаграфічны рух у Еўропе вельмі распаўсюджаны.



Юры Гарулёў

Адным з самых вядомых у каталіцкім свеце з'яўляецца кінафестываль у польскім мястэчку Непакаланаў, які можна назваць братнім для нас: арганізатары зрабілі шмат для таго, каб ланцужок каталіцкіх кінафестываляў быў працягнуты ў Беларусь і Расію. Нягледзячы на тое, што «Magnificat» патрануе Канферэнцыя каталіцкіх епіскапаў Беларусі, ён мае экуменічны напрамак. У нас прадстаўлены і праваслаўныя, і пратэстанцкія фільмы — межаў паміж канфесіямі мы не праводзім.

***— У чым адметнасць сёлетняга фестывалю і яго конкурснай праграмы?***

— Фестываль стаў на ногі — і гэта галоўнае. Напачатку было дастаткова няшмат моцных рэжысёрскіх, аператарскіх работ. Аднак сёння амаль кожная кінакарціна аўтарская, па-мастацку зробленая.

Наш фестываль праводзіцца на Глыбоччыне і ад мястэчковага характару адмаўляцца не збіраецца. Зрэшты, упершыню фестываль адкрыецца ў Мінску, і на тое маюцца свае прычыны. Папершае, сёлетні год адметны для каталіцкіх храмаў горада: Кафедральнаму касцёлу спаўняецца 300 гадоў, Чырвонаму — 100. Абысці гэтыя падзеі фестываль не мае права. Па-другое, хацелася б удзельнікаў фестывалю пазнаёміць са сталіцай, а мінчукоў — з хрысціянскім кіно. Трэцяя прычына: фестываль мусіць стаць больш вядомы ў Беларусі.

***— Як часта хрысціянскае кіно здымаюць у Беларусі? Ці адпавядае яно міжнародным стандартам якасці?***

— У Беларусі маюцца дзве структуры вытворчасці дакументальнага кіно — студыя «Летапіс» на «Беларусьфільме» і «Белвідэацэнтр». Аднак у год яны робяць адну-дзве стужкі з рэлігійна-духоўным ухілам. Астатняе — фільмы, што здымаюцца пры непасрэднай падтрымцы царквы ці касцёла. Так, пры некаторых буйных храмах існуюць асобныя кінастудыі. Сярод іншых можна вылучыць кінастудыю пры Мінскім Свята-Елісавецінскім манастыры. На першыя фестывалі студыя дасылала фільмы, у якіх цалкам ігнаравалася кінематаграфічная стылістыка. Простая кінавыява рэлігійнага казання, пра якія б духоўныя, важныя рэчы не гаварыў герой фільма, — гэта яшчэ не дакументальнае кіно. З кінематаграфічнага пункту гледжання такія карціны не цікавыя. Сёлета студыя даслала стужкі, пра якія можна сказаць, што гэта сапраўднае кіно. У гэтым плане відавочны рост майстэрства айчынных кінавытворцаў.

***— Гадоў пяць-дзесяць таму беларускае дакументальнае кіно зрабіла ладны крок наперад, айчынную дакументалістыку было не сорамна паказваць за мяжой: фільмы Віктара Аслюка і Галіны Адамовіч перамагалі на міжнародных фестывалях. Сёння здаецца, што наша кіно вярнулася ў свой звыклы крызісны стан.***

— Гаворка пра крызіс мае падставу. На тое ёсць свае прычыны. Няма стымулу для майстроў. Моладзі няма. Не хапае плёнкі. Кінастудыя амаль не здымае. Хоць гадоў трыццаць таму ўсё было інакш. На кінастудыі панавала працоўная атмасфера: быў шырокі кадравы склад, былі фільмы, якія ўздымалі праблемы. Зараз нас вельмі мала: працуе ўсяго з дзесятак рэжысёраў. На кінастудыі ўжо другі год адбываецца абнаўленне кінаапаратуры. Аднак ці правільна гэта, калі няма каму працаваць?! Можа, лепей было б сабраць таленавітую моладзь і накіраваць на вучобу ва Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі?

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 843

Падпісана да друку 3.09.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.